Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 СТУДЗЕНЯ 2016 г. ЧАЦВЕР № 6 (28116) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Вынікі «дня дворніка»

СТАР. 2

У краіне выбралі новую сталіцу

СТАР. 3

Сямейная газета

Як дзецям палюбіць кнігу?

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Год культуры прыдасць нашай краіне і людзям, якія жывуць на гэтай зямлі, новыя сілы, думкі, творчасць, энергію, якія дазволяць развіваць і эканоміку, і палітыку, і сацыяльную сферу. Гэта тое, што сёння засяродзіць веды і сілы ў духоўна-маральнай плоскасці. Неабходна прадоўжыць фарміраванне сваёй духоўнай спадчыны, якую ў далейшым перададзім нашчадкам. Менавіта духоўная спадчына — наша каштоўнасць і найвялікшы здабытак».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.01.2016 г.

Долар ЗША	19326,00	▲
Еўра	20928,00	▼
Рас. руб.	252,75	▲
Укр. грыўня	829,09	▲

ISSN 1990 - 763X

ДЗЯТЛАВІЦКАЯ ЗОРКА

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

У вёсцы Дзятлавічы Лунінецкага раёна са старажытнасці ўшаноўваюць Шчадрэц — самы вясёлы час Каляд, а каляднікі апранаюцца ў традыцыйныя карнавальныя касцюмы і носяць «Калядную зорку». Гэткую «зорку», як у палескіх Дзятлавічах, болей не сустрэнеш нідзе. У Стары Новы год на вясковай вуліцы заўсёды можна ўбачыць адданага традыцыям продкаў мастацкага кіраўніка сельскага Дома культуры Мікалая ЯСКЕВІЧА — і абавязкова з «Калядной зоркай».

■ Жыллё

ПРЫЯРЫТЭТ — УЛАСНЫЯ ЗБЕРАЖЭННІ,

а льготнае крэдытаванне будзе паступова змяншацца

Сёлета ў Беларусі плануецца пабудаваць жылых дамоў агульнай плошчай каля 4 млн квадратных метраў. Аб гэтым гаворыцца ў прынятай пастанове Савета Міністраў №1101, што апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Разлічваць на свае сродкі

Спецыялістамі запланавана, што ў шматкватэрных дамах гарадоў будзе пабудавана 1,882 млн квадратных метраў жылля агульнай плошчы, а ў сельскай мясцовасці — 1,468 млн «квадратаў». Бюджэтнае фінансаванне жыллёвай сферы ў гэтым годзе істотна скарацілі, таму для чаргавікоў вырашылі пабудаваць з дзяржаўнай падтрымкай усяго 840 тысяч квадратных метраў, або менш за чвэрць ад усіх аб'ёмаў.

Асобным радком у заданні на 2016 год стаіць Мінск, дзе пабудуюць 735 тысяч квадратных метраў. Заўважу, што менавіта ў галоўным мегаполісе краіны па льготных крэдытах для насельніцтва будзе будавацца мінімальная колькасць жылля — толькі 97 тысяч квадратных метраў агульнай плошчы. Астатнія аб'ёмы будаўніцтва жыхары сталіцы вымушаны будуць фінансаваць з уласных зберажэнняў або з выкарыстаннем крэдытных рэсурсаў на агульных падставах.

Стаўка на сталічны рэгіён

Больш за ўсё жылля мяркуецца ўзвесці ў Мінскай вобласці — 1,1 млн квадратных метраў. Пры гэтым

у сельскіх населеных пунктах і малых гарадскіх паселішчах будзе пабудавана ажно 830 тысяч квадратных метраў жылля. Больш за тое, менавіта ў сталічным рэгіёне запланавана пабудаваць максімальны аб'ём жылля для чаргавікоў з дзяржаўнай падтрымкай — 200 тысяч «квадратаў».

Другое месца па аб'ёмах будаўніцтва жылля займе сёлета Гродзенская вобласць, дзе плануецца пабудаваць 561 тысячу квадратных метраў. А менш за ўсё будуць будаваць жыллё ў Віцебскай вобласці — толькі 288 тысяч «квадратаў».

Максімальную колькасць дамоў па лініі дзяржзаказу плануецца пабудаваць для чаргавікоў у Брэсцкай і Гомельскай абласцях, дзе будзе ўзведзена 101 тысяча і 100 тысяч квадратных метраў жылля адпаведна.

СТАР. 2

■ Стыхія

ЧАКАЕМ «ДАНІЭЛУ-2»?

Сіноптыкі прагназуюць, што ўжо ў суботу да нас завітае чарговы снежны цыклон

Першая палова студзеня абяцае стаць сапраўды багатай на сінаптычныя сюрпрызы. Мінулы цыклон «Даніэла», які прынёс у аўторак на тэрыторыю краіны добрую порцыю снегу, будзе не апошнім на гэтым тыдні. Спецыялісты службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра даюць беларускім камунальнікам толькі некалькі спакойных дзён для навядзення парадку ў заснежаных гарадах...

Паводле іх прагнозаў, удзень у чацвер толькі месцамі чакаецца невялікі кароткачасовы снег. Увогуле, сёння ўмовы надвор'я на тэрыторыі Беларусі будзе вызначаць халодная вільготная паветраная маса, якая паступае з Балтыйскага мора. Будзе воблачна з праясненнямі. У асобных раёнах слабая мяцеліца, па паўднёвым усходзе месцамі захаваецца слабы галалёд. На некаторых участках дарог галалёдзіца. Вецер заходні 5—10 м/с. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе 3—9 градусаў марозу. У пятніцу тэрыторыя краіны будзе знаходзіцца ў асноўным пад уплывам павышанага атмасфернага ціску і халодных паветраных мас, якія паступаюць з поўначы Еўропы. Пахаладае. Прагназуецца воблачна з праясненнямі.

СТАР. 2

■ Ліквідацыя

НАСТУПСТВЫ СТЫХІІ

будуць аператыўна ліквідаваны

Пра гэта паведаміў Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандр Косінец, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Усё ідзе ў штатным рэжыме, наступствы будуць у кароткі прамежак часу ліквідаваны», — сказаў Аляксандр Косінец. Пры гэтым ён падкрэсліў, што самае галоўнае — ад стыхіі не пацярпелі людзі.

Разам з тым, паводле слоў Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, чакаецца сур'ёзная размова наконт памылак. «Пэўныя пазіцыі «праспалі». Маглі б своечасова, калі было папярэджанне Гідраметцэнтра, прыняць рашэнне на месцах, падрыхтавацца як належыць і ў многім мінімізаваць і затраты, і нязручнасці для грамадзян», — звярнуў увагу Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Наступствы моцных снегападаў найбольш сур'ёзна адчуваюцца ў сталіцы, таксама пацярпелі Мінская вобласць, асабліва поўдзень (Старыя Дарогі, Слуцк, Салігорск), Віцебск. «Мы зробім усё, каб літаральна да раніцы заўтрашняга дня аднавіць электраэнергію і забяспечыць яе падачу ва ўсе населеныя пункты», — гарантаваў Аляксандр Косінец. На гэты момант для падачы электраэнергіі задзейнічалі больш як 1 тыс. дызель-генератараў.

У Беларусі ўжо зроблена ўсё неабходнае для функцыянавання транспарту, пуцеправодаў. Белкаапсаюз, арганізацыі спажыўкааперацыі дастаўляюць прадукты ва ўсе населеныя пункты. Паклапаціліся аб адзінокіх людзях.

Аляксандр Косінец падкрэсліў, што пільная ўвага цяпер будзе ўдзяляцца дарогам камунальнага значэння, мастам і дварам, у якіх застаецца шмат снежных заносаў. Ён заклікаў беларусаў прыняць самы актыўны ўдзел у ліквідацыі наступстваў стыхіі.

Як паведамлялася, Прэзідэнт Беларусі напярэдадні даручыў прэм'ер-міністру Андрэю Кабякову і Кіраўніку Адміністрацыі Аляксандру Косінцу ўзяць на кантроль пытанні ліквідацыі наступстваў стыхіі ў краіне. У пятніцу кіраўніку дзяржавы будзе даложана аб выкананні гэтага даручэння.

Вайскоўцы не засталіся ўбаку

Больш за тысячу ваеннаслужачых падключыліся да ліквідацыі наступстваў магутнага цыклону, які заваліў Беларусь снегам. У дапамогу камунальнікам на мінскія і баранавіцкія вуліцы выйшла спецыяльная тэхніка Міністэрства абароны.

Фота БЕЛТА.

У прыватнасці, гэта электрастанцыі магутнасцю 100 кВт на базе аўтамабіляў «Урал», якія ў выніку выхаду са строю стацыянарных падстанцый здольны забяспечыць электраэнергіяй некалькі шматкватэрных жылых дамоў і аб'ектаў інфраструктуры.

Рашэнне аб вылучэнні асабовага складу і тэхнікі воінскіх часцей Міністэрствам абароны было прынята ў сувязі з неспрыяльнымі ўмовамі надвор'я. Акрамя таго, звароты аб аказанні дапамогі ў расчыстцы населеных пунктаў ад снегу паступілі ў адрас ваеннага ведамства ад мясцовых органаў улады. Для забеспячэння ўзаемадзеяння з апошняй ва ўпраўленні супрацьпажарнай абароны і аварыйна-выратавальных работ Узброеных Сіл створана аператыўная група.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

ДЗЕНЬ ДВОРНІКА

Падчас праходжання цыклону праз краіну ў гэтай ролі давялося пабываць многім

Гаворка не толькі ўласна пра работнікаў ЖЭСаў і дарожных службаў, а таксама вясковых жыхароў, якім — хочаш не хочаш — неадкладна трэба было чысціць ад снегу ўласныя падворкі. Узяць рыдлёўку прыйшлося і гараджанам: аўтамабілістам, даішнікам, спецназаўцам, работнікам гандлю.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

ПАРАДУЮЦЦА ХІБА БЛЯХАРЫ...

Найбольш дасталося мінчанам і жыхарам Мінскай і Віцебскай абласцей. Па інфармацыі сіноптыкаў, менавіта ў гэтых двух рэгіёнах выпала максімальная колькасць ападкаў: у сталічнай вобласці вышыня снегу вагалася ад 16 да 33 сантыметраў, у паўночным абласным цэнтры яна дасягала 31 сантыметра. А рэкардсменам стаў Мінск. На ранак учарашняга дня вышыня снегавога покрыва складала ў горадзе 33 сантыметры. Яго прырост за ноч і дзень 12-га склаў 21 сантыметр. Тым не менш учора двары і дарогі былі чыстымі ад снегу. Невялікія «казіныя сцежкі» заставаліся хіба толькі ў баку ад асноўных шляхоў перасоўвання гараджан. Праўда, падчас снегападу ў сталіцы, па звестках ДАІ, колькасць дарожна-транспартных здарэнняў павялічылася ўдвая ў параўнанні са звычайнымі днямі. За суткі адбылося 170 аварый, адзін чалавек пацярпеў. Так што дзень праходжання праз сталіцу цыклону можна назваць не толькі «днём дворніка», але і «днём бляхара», як гавораць самі аўтамабілісты.

ТРАНСПАРТНЫЯ АРТЭРЫІ СПРАЎЛЯЛІСЯ

На барацьбу з наступствамі стыхіі было кінута больш за 4,1 тысячы адзінак тэхнікі і больш за 18,8 тысячы чалавек розных арганізацый. Падраздзяленні МНС аказалі дапамогу ў вызваленні са снежных заносаў 17 транспартных сродкаў: 15 грузавікоў, двух аўтамабіляў хуткай дапамогі, у якіх агулам знаходзіліся 24 чалавекі. На шчасце, ніхто не пацярпеў. У ранішні час «пік» у сталіцы былі зарэгістраваны 13 выпадкаў парушэння руху грамадскага транспарту. У Мінску падчас цыклону на тых участках дарог, дзе ёсць спускі і пад'ёмы, здымаліся з маршрутаў тралейбусы, на змену якім выходзілі аўтобусы. Кіраўнікам транспартных арганізацый было прадпісана максімальна абмежаваць выезд і перасоўванне грузавых аўтамабіляў дазволенай максімальнай масай больш за 3,5 тоны.

Дарожнікі нагадваюць пра наяўнасць адзінага тэлефоннага нумару дыспетчарскіх службаў арганізацый рэспубліканскай дарожнай гаспадаркі. Набраўшы «125» у любым рэгіёне краіны, удзельнікі дарожнага руху могуць паведаміць важную інфармацыю або выказаць прэтэнзіі наконт дарожных умоў.

ЗДАРЭННЯЎ АМАЛЬ НЕ БЫЛО

Па звестках «Белэнерга», на ранак учарашняга дня без электразабеспячэння заставаліся 313 населеных пунктаў. Большасць — з колькасцю жыхароў да 50 чалавек. Аварыйныя брыгады працягвалі аднаўленчыя работы. У сталічнай вобласці задзейнічана амаль 250 спецыялістаў і 76 адзінак тэхнікі.

Сярод здарэнняў падчас цыклону: перавод з-за адключэння электраэнергіі 11 пацыентаў Лапіцкай участковай бальніцы Асіповіцкага раёна ў цэнтральную раённую бальніцу. Увечары ў выніку падзення дрэва на кантактную сетку каля чыгуначнай станцыі «Вярэйцы» зноў у Асіповіцкім раёне адбылося вымушанае спыненне электрапоезда рэгіянальных ліній Мінск—Асіповічы. Затрымка руху склала 27 хвілін. Таксама ўвечары абрынулася жалезабетоннае перакрыцце на плошчы 80 квадратных метраў цаглянага будынка цялятніка 1964 года пабудовы ў вёсцы Вайганы Валожынскага раёна. Работнікі МНС і мясцовай гаспадаркі эвакуіравалі 208 цялят узростам да шасці месяцаў. Пацярпелых не было. Часова з-за прарыву цеплатрасы без цепла- і гарачага водазабеспячэння заставаўся абласны дзіцячы цэнтр медыцынскай рэабілітацыі «Пухавічы» (179 дзетак).

ПРАЦА Ў ШТАТНЫМ РЭЖЫМЕ

Нацыянальны аэрапорт Мінск працаваў у штатным рэжыме. Для ўборкі снегу ў складаных умовах было задзейнічана 30 адзінак спецтэхнікі. У выпадку неабходнасці аэрапорт мог бы забяспечыць гарачым харчаваннем (запас прадуктаў ёсць на 3 тысячы чалавек на пяць дзён) пасажыраў, тых, хто іх сустракае і праводзіць, а таксама размясціць для адпачынку са стварэннем камфортных умоў. Пасажыраў без грошай маглі забяспечыць бясплатным харчаваннем.

Беларуская чыгунка аператыўна забяспечвала своечасовую ачыстку пуцей ад снегу. На ачыстцы стрэлачных пераводаў на станцыях працавала больш за 1,7 тысячы чалавек. На перагонах і станцыях было задзейнічана шэсць снегаўборачных машын. Своечасова ўбіраліся ад снегу і пасыпаліся пясчана-салянай сумессю пасажырскія платформы і прылеглыя да чыгуначных вакзалаў тэрыторыі. Затрымак у руху цягнікоў не было.

Нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, усе 754 аўтакрамы Белкаапсаюза выйшлі на маршруты ў адпаведнасці з зацверджанымі графікамі. Усе машыны былі ўкамплектаваныя ў адпаведнасці з асартыментнымі пералікамі.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ЧАКАЕМ «ДАНІЭЛУ-2»?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Месцамі кароткачасовы снег, на дарогах галалёдзіца. Вецер няўстойлівы слабы. Мінімальная тэмпература паветра ўначы будзе мінус 9—16 градусаў, пры праясненнях — 17—20 марозу. Удзень мінус 6—13 градусаў, па паўднёвым захадзе — 2—5 марозу.

А потым будзе субота, калі надвор'е пачне вызначаць цыклон, які змяшчаецца з паўднёвага захаду Еўропы праз паўднёвы ўсход Беларусі і далей у бок Расіі. Таму амаль паўсюдна чакаецца снег. Месцамі завіруха. Па паўднёва-ўсходняй палове прагназуецца моцны снег, мокры снег, на дарогах снежныя заносы, наліпанне мокрага снегу і галалёд. Вецер усходні з пераходам на паўночна-заходні ўмераны, удзень у асобных раёнах краіны — парывісты (15—18 м/с). Мінімальная тэмпература паветра ўначы чакаецца ў межах мінус 8—15 градусаў, па паўночным захадзе пры праясненнях — 16—18 марозу, па поўдні — мінус 2—7 градусаў. Удзень тэмпературны фон ужо істотна зменіцца, бо максімальная тэмпература будзе вагацца ад нуля па паўднёвым усходзе, да мінус 13 градусаў па паўночным захадзе краіны.

Часткова зачэпіць чарговы цыклон і тэрыторыю нашай сталіцы. У Мінску ў суботу пройдзе снег, раніцай і ўдзень — моцны снег, вецер з парывамі да 14 м/с. Тэмпература паветра уначы — мінус 8—10, а ўдзень — мінус 6—8 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у нядзелю надвор'е крыху супакоіцца. Уначы на большай частцы тэрыторыі Беларусі снег, слабая мяцеліца, а ўдзень — кароткачасовы снег. На асобных участках дарог захаваецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе мінус 8—15 градусаў, пры праясненнях — 16—20 марозу, удзень чакаецца мінус 6—13 градусаў, месцамі — мінус 14—16.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■

ПРЫЯРЫТЭТ — УЛАСНЫЯ ЗБЕРАЖЭННІ

Па арэндным жыллі лідзіруе Гродзеншчына

Эксперты ад Мінбудархітэктуры падлічылі, што сёлета будзе пабудавана 127,2 тысячы квадратных метраў арэнднага жылля. Дарэчы, больш траціны вызначаных аб'ёмаў будаўніцтва плануецца ўвесці ў Гродзенскай вобласці (53 тысячы квадратных метраў). Увогуле, такое жыллё будзе пабудавана ва ўсіх абласцях. Выключэнне складзе Мінск, дзе будаўніцтва жылых дамоў (кватэр) для прадастаўлення жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання не прадугледжана.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Не трапіў сталічны рэгіён і ў планы будаўніцтва жылых дамоў у гарадах-спадарожніках. Сёлета па гэтым напрамку будзе пабудавана 241 кватэра толькі ў Жабінцы (Брэсцкая вобласць) і Скідзелі (Гродзенская вобласць).

Шматдзетным — у першую чаргу

За гэты год у Беларусі плануецца ўвесці ў эксплуатацыю жылыя памяшканні (дамы, кватэры) для 2 194 шматдзетных сем'яў. Агульная плошча жылля для гэтай ільготай катэгорыі павінна скласці 191,2 тысячы квадратных метраў. Больш за ўсё жылля для шматдзетных будзе пабудавана ў Мінску (51,4 тысячы квадратных метраў), а мінімум — у Віцебскай вобласці (8 тысяч квадратных метраў).

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ПАЧУЦЬ І ДАПАМАГЧЫ

У краіне працягваюць дзейнічаць прамыя тэлефонныя лініі

Уцяпліць дом, добраўпарадкаваць вуліцу або прыватызаваць кватэру — з такімі пытаннямі звяртаюцца жыхары краіны да мясцовых улад. Практыка стасункаў з чыноўнікамі і вырашэння пытанняў пры дапамозе прамых тэлефонных ліній існуе ўжо практычна год і прыносіць свой плён.

У гэтую суботу, 16 студзеня, з 9.00 да 12.00 на званкі адкажуць:

Брэсцкі аблвыканкам
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

Віцебскі аблвыканкам
намеснік старшыні МАЦКЕВІЧ Алег Сяргеевіч (80212222222);

Гомельскі аблвыканкам
намеснік старшыні ПАЧЫНОК Алег Міхайлавіч (80232751237);

Гродзенскі аблвыканкам
намеснік старшыні АГЕЙ Алена Аляксандраўна (80152735644);

Мінскі аблвыканкам
кіраўнік спраў МАРКЕВІЧ Іван Станіслававіч (80175004160);

Магілёўскі аблвыканкам
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

Мінскі гарвыканкам
старшыня ШОРАЦ Андрэй Віктаравіч (80172224444).

■ Нашы дзеці

САМЫЯ ЎДЗЯЧНЫЯ ГЛЕДАЧЫ

Сапраўднае свята самым маленькім сваім гледачам падарылі артысты Драматычнага тэатра Беларускай арміі. У межах дабрачыннай акцыі «Нашы дзеці» дзеці-сіроты і інваліды дашкольнага і школьнага ўзросту, а таксама дзеці са шматдзетных сем'яў убачылі спектакль-казку «Снежная каралева».

— Акцыя «Нашы дзеці», якая праводзіцца ў тэатры, — не аднадзённае мерапрыемства, яно не абмежавана пэўнымі часавымі рамкамі, — падкрэсліў **начальнік Драматычнага тэатра Беларускай арміі Аляксандр ГРУЕНКА.** — Мы пастаянна маем зносіны з дзецьмі, паверце, больш удзячных гледачоў не знайсці. Яны нашы самыя дарагія сябры, якіх мы заўсёды рады прымаць у сябе. У сваю чаргу, з задавальненнем выязджаем да іх.

Нягледзячы на спецыфіку тэатра, некалькі спектакляў для самых маленькіх у яго рэпертуары ўсё ж такі знойдзецца. Казка «Прынцэса і салдат» карыстаецца папулярнасцю ўжо каторы год. «Снежную каралеву» юныя гледачы ўпершыню ўбачылі не так даўно, але ўжо паспелі займець любімых персанажаў. Ацанілі пастаноўку і на больш высокім узроўні: па выніках III рэспубліканскага конкурсу тэатральнага мастацтва «Нацыянальная тэатральная прэмія» казка была прызнана «Лепшым спектаклем для дзяцей».

Кацярына Качур — са шматдзетнай сям'і. Дзяўчынка ўжо бачыла «Снежную каралеву», але не ўпусціла магчымасць яшчэ раз сустрэцца са сваімі любімымі героямі. Разам з ёй спектакль паглядзела каля 250 выхаванцаў SOS-дзіцячай вёскі Бараўляны, Бягомльскай дапаможнай школы-інтэрната, Дома міласэрнасці, Асацыяцыі шматдзетных бацькоў і іншых арганізацый.

— Такія мерапрыемствы карысныя не толькі для дзяцей, але і для іх бацькоў, — перакананая **дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Людміла КУБРАКОВА**. — Шматдзетныя маці, а таксама жанчыны, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, не часта могуць дазволіць сабе пайсці ў тэатр або наведаць іншыя ўстановы культуры. Паколькі я ўзначальваю Асацыяцыю шматдзетных бацькоў Фрунзенскага раёна Мінска, добра ведаю, як такім сем'ям патрэбна наша ўвага. Сёння яны адчуваюць падтрымку кіраўніка дзяржавы. Большасць сем'яў не баіцца нараджаць. У нашу арганізацыю, напрыклад, уваходзяць сем'і, у якіх выхоўваюцца і 10, і 12 дзетак. І нельга сказаць, што нараджаюць дзеля льгот. Я бачу, што гэтыя дзеці жаданыя.

Вераніка КАНЮТА.
kanyuta@zviazda.by

■ Экалогія

ІХ СТАЛА МЕНШ

203 населеныя пункты выведзены з зоны радыеактыўнага забруджвання

Адпаведнае рашэнне аб гэтым прыняў Савет Міністраў краіны пастановай №9 ад 11 студзеня 2016 года.

Згодна з пералікам, да зон радыеактыўнага забруджвання цяпер адносяцца 2 тысячы 193 населеныя пункты і 52 аб'екты. Такім чынам, за 5 апошніх гадоў зона радыеактыўнага забруджвання скарацілася на 203 паселішчы і 20 аб'ектаў. Колькасць насельніцтва, якое пражывае ў населеных пунктах, што выходзяць з зон радыеактыўнага забруджвання, складае 30 тысяч 912 чалавек. Пры падрыхтоўцы пераліку выкарыстаны звесткі аб шчыльнасці забруджвання глеб цэзіем-137, стронцыем-90, плутоніем-238, 239, 240 па стане на 1 студзеня 2015 года, а таксама даныя «Каталога сярэдніх гадавых эфектыўных доз апраменьвання жыхароў населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь».

Акрамя таго, у сувязі з памяншэннем шчыльнасці забруджвання глеб радыенуклідамі і зніжэннем сярэдніх гадавых эфектыўных доз апраменьвання насельніцтва, дакументам прапісваецца пераход 133 населеных пунктаў у менш жорсткія зоны радыеактыўнага забруджвання. Так, у параўнанні з папярэднім пералікам колькасць населеных пунктаў у зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем зменшылася з 1 тысячы 900 да 1 тысячы 827, у зоне з правам на адсяленне — з 478 да 353, а ў зоне наступнага адсялення — з 18 да 13.

Памяншэнне забруджвання дазваляе перавесці 128 населеных пунктаў, якія знаходзяцца цяпер у зоне з правам на адсяленне, у зону пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем. А з зоны наступнага адсялення ў зону з правам на адсяленне перавядуць 5 населеных пунктаў.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ У руху

У БЕЛАРУСІ — НОВАЯ СТАЛІЦА. МАЛАДЗЁЖНАЯ...

Маладзёжнай сталіцай Беларусі ў 2016 годзе на конкурснай аснове быў выбраны горад Баранавічы. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра адукацыі Віктар ЯКЖЫК.

Усяго ў конкурсе ўдзельнічалі 10 гарадоў, а ў фінале за званне маладзёжнай сталіцы змагаліся Горкі, Глыбокае і Баранавічы. Конкурсны адбор ажыццяўляўся на падставе многіх крытэрыяў: у прыватнасці, улічваліся колькасць моладзі ў населеным пункце, добраўпарадкаванне тэрыторыі горада, магчымасці для атрымання якаснай адукацыі, баўлення вольнага часу моладдзю і іншыя. Найлепшым па ўсіх напрамках стаў горад Баранавічы. Першыя мерапрыемствы пройдуць у маладзёжнай сталіцы ўжо напрыканцы студзеня — размова ідзе аб правядзенні ў гэтым горадзе Рэспубліканскага студэнцкага форуму. Летась аналагічны форум праходзіў у Горках на базе Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі і сабраў больш як 600 студэнтаў-актывістаў з 44 ВНУ. На працягу года ў Баранавічах будуць праходзіць шматлікія рэспубліканскія мерапрыемствы: акцыі, сустрэчы, канферэнцыі. У іх возьмуць удзел прадстаўнікі студэнцкай і працоўнай моладзі з ўсёй Беларусі.

Як зазначыла **начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі Наталля ПШАНІЧНАЯ**, ідэя з выбарам маладзёжнай сталіцы — не эксклюзіўная. Такую сталіцу выбіраюць у Еўропе, Арменіі, Азербайджане...

— Мы адчулі, што і беларускія гарады будуць зацікаўленыя, а Год моладзі эмацыянальна падштурхнуў нас да гэтага кроку, — дадала Наталля Пшанічная.

На сённяшні дзень колькасць маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года налічвае ў Беларусі больш за 2,1 млн, што складае 23 працэнты ад агульнай колькасці насельніцтва.

У Год моладзі шмат маладзёжных мерапрыемстваў, што праходзілі ў краіне, мелі прыстаўку «першы»: першы Рэспубліканскі форум сельскай моладзі, першы Рэспубліканскі форум спецыялістаў па рабоце з моладдзю, першая міжнародная канферэнцыя па развіцці студэнцкага самакіравання. У новым фармаце прайшоў Дзень моладзі на «Славянскім базары». Для таго, каб лепш наладзіць узаемадзеянне з самой моладдзю, пры міністры адукацыі былі створаны новыя грамадскія дарадчыя структуры: Рэспубліканскі студэнцкі савет, у які ўвайшлі прадстаўнікі ўсіх вышэйшых навучальных устаноў краіны, і Рэспубліканскі маладзёжны савет, куды ўвайшлі ўжо не толькі студэнты, але і рабочая моладзь, маладыя навукоўцы, прадстаўнікі прафсаюзаў, дэпутаты і іншыя. Галоўная задача гэтых структур — далучаць моладзь да вырашэння важных праблем. Студэнты, напрыклад, узнімалі і абмяркоўвалі ў сацыяльных сетках праблемы размеркавання, студэнцкага самакіравання, цэнтралізаванага тэсціравання і іншыя...

Акрамя таго, летась быў распрацаваны праект дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка на 2016—2020 гады». Гэта таксама важны стратэгічны крок наперад. Былі ўнесены змяненні ва ўказ аб дзейнасці студэнцкіх атрадаў, накіраваныя на фінансавую падтрымку руху, і калі ў 2011 годзе ў студатрадах працавала крыху больш як 27 тысяч маладых людзей, то летась іх колькасць перавысіла ўжо 70 тысяч. Таксама менавіта ў Год моладзі была зацверджана канцэпцыя добраахвотніцкага валанцёрскага руху. Увогуле год быў вельмі плённы, і важна, што многія праекты, якія стартавалі летась, атрымаюць працяг у наступныя гады.

Віктар Якжык паведаміў, што Беларусь плануе ў сярэдзіне студзеня прыняць удзел у Сусветным форуме міністраў адукацыі ў Лондане. Традыцыйна падчас гэтага глабальнага мерапрыемства абмяркоўваюцца важныя пытанні якасці адукацыі, рэалізацыі Балонскіх дамоўленасцяў і нацыянальныя асаблівасці прадастаўлення адукацыі замежным грамадзянам. Летась Беларусь таксама стала ўдзельніцай Балонскага працэсу, таму многія пункты ў парадку дня форуму ўяўляюцца для нас надзвычай актуальнымі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ЯНЫ СТАЛІ НАЙЛЕПШЫМІ

Лёгкаатлеты краіны адзначаны спецыяльнымі ўзнагародамі

Вось ужо другі год запар вынікі мінулага сезона федэрацыя лёгкай атлетыкі падводзіць ва ўрачыстай абстаноўцы, вылучаючы самых лепшых спартсменаў і трэнераў. Для гэтага заснавана спецыяльная ўзнагарода — «Атлетыка», яна ўручаецца ў розных узроставых катэгорыях і акрамя арыгінальнай статуэткі прадугледжвае грашовую прэмію ад федэрацыі.

Урачыстая цырымонія прайшла ў адным са сталічных рэстаранаў, спартсменкі надзелі вячэрнія сукенкі і ўсталі на абцасы, а прадстаўнікі моцнага полу змянілі спартыўныя касцюмы на элегантныя. Сёлета, мабыць, цырымонія была пазбаўлена інтрыгі: пра тое, хто стане найлепшым, здагадваліся як прадстаўнікі СМІ, так і самі намінанты. Але, нягледзячы на гэта, усе былі ў добрым настроі, што надавала вечару святочную атмасферу.

Кіраўнік федэрацыі Вадзім ДЗЕВЯТОЎСКІ ў прывітальным слове адзначыў, што 2015-ты стаў паспяховым для беларускай лёгкай атлетыкі. *«Дзякуй за сумленную, шчырую працу. Нам ёсць чым ганарыцца, і хацелася б пажадаць працягнуць працу ў тым жа тэмпе»*, — адзначыў ён.

Пераможцаў у кожнай намінацыі выбіралі самі члены федэрацыі, і найбольшую цікавасць, вядома, выклікала абсалютная ўзроставая катэгорыя. У ёй пераможцай сярод жанчын прадказальна стала **Марына АРЗАМАСАВА**. Яна, дарэчы, другі год запар прызнаецца найлепшай спартсменкай краіны. У мінулым сезоне Арзамасава выйграла залаты медаль на чэмпіянаце свету ў Пекіне ў бегу на 800 м, што стала самым лепшым дасягненнем сярод беларускіх спартсменаў, якія прымалі ўдзел у сусветным форуме.

— Я старалася, шмат працавала, каб стаць найлепшай не толькі ў Беларусі, але і ў свеце. Адно з другога выцякае. Мне вельмі прыемна, што наша з трэнерам праца высока ацэньваецца. У мінулым годзе ўсё склалася так, як трэба. Патрэбныя людзі апынуліся ў патрэбным месцы менавіта тады, калі гэта было неабходна, — адзначыла Марына.

Сярод мужчын у гэтай намінацыі найлепшым быў названы **Аляксандр ЛІННІК**. У 2015 годзе на камандным чэмпіянаце Еўропы па лёгкай атлетыцы ў Чэбаксарах ён стаў уладальнікам бронзавай узнагароды ў бегу на 400 м і пабіў нацыянальны рэкорд (45,43 сек.), які трымаўся больш за 30 гадоў.

Найлепшым трэнерам у мужчын прызнаны Аляксандр Сідарук, у жанчын — Наталля Духнова. Спецыяльнай узнагародай «Прарыў года» была адзначана **Аліна ТАЛАЙ**, якая стала бронзавай прызёркай чэмпіянату свету ў бегу на 100 метраў з бар'ерамі.

У ІНШЫХ НАМІНАЦЫЯХ ПЕРАМАГЛІ:

Катэгорыя «Юнакі»:

найлепшая спартсменка — Віялета Скварцова (скачкі ў даўжыню);

найлепшы спартсмен — Глеб Жук (кіданне дыска);

найлепшы трэнер — Васіль Капцюх.

Катэгорыя «Юніёры»:

найлепшая спартсменка — Эльвіра Герман (60 м/100 м з бар'ерамі);

найлепшы спартсмен — Максім Андралойць (шматбор'е);

найлепшы трэнер — Віктар Мяснікоў.

Катэгорыя «Моладзь»:

найлепшая спартсменка — Алена Собалева (кіданне молата);

найлепшы спартсмен — Аляксандр Казлоўскі (кіданне кап'я);

найлепшы трэнер — Людміла Кунац.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.
lobazhevich@zviazda.by

■ Чулі?!

ЧЭМПІЯНАТ ПАРЫ

«Славутыя Полацкія лазні — 2016» вызначаць самага трывалага парыльшчыка.

— Жыхары раёна паспаборнічаюць на вытрымку і стойкасць у экстрэмальных умовах. Сярод удзельнікаў будуць прадстаўнікі сельскіх Саветаў, каманды прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў, — паведаміла «Звяздзе» **Валянціна УЛАСЕНКА, прэс-сакратар Полацкага райвыканкама.**

Як адзначаюць арганізатары, перспектыва пазмагацца за «золата» выклікала здаровы ажыятаж. На сёння падалі заяўкі ўжо 13 каманд (у складзе каманды — мужчына і жанчына).

Праграма правядзення чэмпіянату вельмі насычаная. Сярод іншага запланаваныя: хвастанне венікам і выпрабаванне вадой, катанне ў снезе, дэгустацыйна-забаўляльная праграма «Рускі самавар».

Пераможцаў узнагародзяць каштоўнымі прызамі. Напэўна, самым пажаданым стаў бы «каштоўны венік», як у фільме «Іронія лёсу». А калі сур'ёзна, каманды-пераможцы атрымаюць кубкі. Узнагародзяць і самага вялікаўзроставага ўдзельніка, і пераможцу ў конкурсе «Самы трывалы парыльшчык». Усім аматарам лазні будуць уручаны памятныя значкі чэмпіянату.

Фэст пройдзе 23 студзеня на базе сялянска-фермерскай гаспадаркі ў вёсцы Каношы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Рабі дабро

МАЛЕНЬКІ КАЛЯДНЫ ЦУД

Што рухае людзьмі, якія дапамагаюць хворым?

Можна шмат разважаць аб тым, як свет становіцца жорсткім і прагматычным, шукаць і аналізаваць прычыны такога становішча, а можна проста зрабіць нешта добрае, і тым самым крышачку палепшыць гэты свет. Без асаблівых дэкларацый і рыторыкі.

Вось, напрыклад, буйная транспартная кампанія з Брэста ў гэтым годзе адмовілася ад пакупкі традыцыйных навагодніх сувеніраў для партнёраў і кліентаў. Але грошы з пачатку года на гэтыя траты былі прадугледжаны ў бюджэце арганізацыі. Іх, паводле рашэння калектыву, пералічылі на аперацыю і лячэнне 13-гадовага хлопчыка Антона Куцінава. Складаная аперацыя запланаваная на люты гэтага года. І ўсе супрацоўнікі фірмы «Транскансалт» спадзяюцца, што яна пройдзе найлепшым чынам і юны брастаўчанін здолее перамагчы хваробу.

Варта сказаць, што паспяховая кампанія не абмежавалася адной акцыяй. Транспартнікі паспрабавалі прыцягнуць да добрай справы партнёраў, іншых людзей бізнесу, усіх нераўнадушных грамадзян. Для гэтага разам з брэсцкім дабрачынным фондам «Сэрца — дзецям» яны стварылі спецыяльны раздзел на сайце. На ім змясцілі здымкі і кароткія гісторыі дзяцей, якім тэрмінова патрэбная дапамога. А замест віншавальнай карткі абанентам рассылаецца дабрачынны каляндар з заклікам далучыцца да акцыі.

«Мы верым, што адзін маленькі цуд важнейшы за траты на навагоднія падарункі. Разам мы можам зрабіць шчаслівейшым наступны год для дзяцей, якія маюць патрэбу ў дапамозе», — з такімі словамі звярнуліся супрацоўнікі кампаніі да цяперашніх і будучых аднадумцаў.

У гэтыя святочныя дні адчула на сабе цяпло душы многіх і многіх незнаёмых людзей сям'я Хініч з Брэста. Пасля адной з дабрачынных акцый напрыканцы мінулага года пра іх бяду праз сродкі масавай інфармацыі даведаўся, лічы, увесь горад. Іна і Дзмітрый Хінічы выхоўваюць хлопчыкаў-трайнятак. Двум з іх амаль адразу пасля нараджэння паставілі дыягназ «дзіцячы цэрэбральны параліч». Дзеці маюць патрэбу ў лячэнні за мяжой. А тут новае гора звальваецца на сям'ю — бацька захварэў на анкалогію. Пасля ампутацыі нагі ў лёгкіх Дзмітрыя выявілі метастазы небяспечнай хваробы. Ён праходзіць лячэнне. Мама Іны, бабуля трайнятак, якая найбольш дапамагала сям'і, памерла ад раку ў пачатку мінулага года... На сайтах, у газетах паявіліся рахункі, на якія можна пералічваць грошы. І многія адгукнуліся.

Да аднаго з кліентаў, які запаўняў паперы на пералічэнне пэўнай сумы для гэтай сям'і, падышла загадчыца аддзялення банка, разгаварыліся. Банкаўскі работнік адзначыла, што на яе памяці першы раз назіраецца такая актыўнасць людзей у імкненні дапамагчы тым, хто трапіў у бяду. І гэта ў час крызісу, калі столькі людзей застаецца без працы альбо сыходзіць у вымушаны адпачынак. Варта сказаць, што названае аддзяленне банка знаходзіцца на вуліцы Суворава, у раёне, дзе шмат інтэрнатаў, дамоў маласямейнага тыпу, адным словам, у небагатым раёне. Вельмі хочацца спадзявацца, што неабходная для лячэння сума будзе сабраная агульнымі намаганнямі нераўнадушных людзей.

Акцыя «Нашы дзеці», як вядома, працягваецца ў краіне. Адным з яе мерапрыемстваў стала дабрачынная вечарына ў брэсцкім рэстаране «Ташкент» для сямей, у якіх выхоўваюцца хворыя дзеці. Мерапрыемства арганізавала рэгіянальнае аддзяленне «Беларускага саюза жанчын». Брэсцкія прадпрымальнікі Руслан Гілязаў, Уладзіслаў Бяркоўскі, Ларыса Маляўка, Наталля Ільніцкая і іншыя купілі калядныя падарункі. Арганізатары падрыхтавалі вясёлую і цікавую праграму. Адзін вечар для бацькоў з дзеткамі стаў сапраўды чароўным.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevihc@zviazda.by

ГАДЖЭТ З НУЛЯ... У 89 ГАДОЎ

Праект МТС па навучанні пажылых людзей сучасным тэхналогіям аказаўся адной з найлепшых сацыяльных ініцыятыў года. Ён прынёс беларускаму мабільнаму аператару перамогу адразу ў трох намінацыях на конкурсе карпаратыўных сацыяльных ініцыятыў «Best in CSR». У апошнім прынялі ўдзел каля 40 праектаў з Беларусі, Расіі, Украіны і Казахстана.

Адукацыйныя ініцыятывы МТС па навучанні пажылых людзей мабільным гаджэтам, камп'ютару і інтэрнэту праводзяцца ўжо не першы год. Удзельнікамі праграм за гэты час сталі больш як 5 тысяч пажылых людзей з 11 гарадоў краіны. Самому старэйшаму — 89 гадоў!

Сёлета праект «Сэцівў ўсе ўзросты пакорныя» прадставіў новую праграму МТС «Планшэт з нуля». Як заявіў **генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ**, ужо праз месяц сертыфікаты аб мабільнай адукаванасці атрымаюць больш за дзвесце беларускіх пенсіянераў.

Адукацыйныя праграмы МТС арыентаваны на новых карыстальнікаў планшэтаў, смартфонаў і камп'ютараў і пачаткоўцаў. Яны ўключаюць у сябе ўрокі інтэрнэт-асветы, а таксама практычныя заняткі па рабоце з сучаснымі гаджэтамі.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

«ЗАГІНУЛЫХ СЯРОД ДЗЯЦЕЙ НЯМА»

У Мінску знізілася колькасць ДТЗ з удзелам дзяцей

Летась у сталіцы зафіксавалі 52 падобныя аварыі. На шчасце, загінулых сярод дзяцей няма. 35 з іх атрымалі траўмы рознай складанасці.

Вікторыя Царук, старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Кастрычніцкага РУУС, расказала «Звяздзе», што змены ў правілах дарожнага руху і ўвядзенне адміністрацыйнай адказнасці за невыкарыстанне дзіцячых аўтакрэслаў скараціла колькасць пацярпелых дзяцей-пасажыраў больш як у два разы. 53 дзіцяці пацярпелі як пешаходы, а 8 у момант здарэння рухаліся на веласіпедзе. Варта дадаць, што ў большасці выпадкаў вінаватыя менавіта кіроўцы. І толькі 20% здарэнняў адбыліся па віне дзяцей.

— Што тычыцца Кастрычніцкага раёна Мінска, за мінулы год адбылося 4 ДТЗ з удзелам дзяцей, у якіх чацвёра атрымалі пашкоджанні. Усе яны былі пешаходамі, — кажа Вікторыя Царук. — Нягледзячы на тое, што ў Мінску намецілася станоўчая дынаміка па зніжэнні дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму, узровень небяспекі застаецца высокім.

Асноўнымі прычынамі дарожных здарэнняў з дзецьмі на дарозе з'яўляюцца пераход праезнай часткі ў недазволеным месцы, нечаканы выхад на дарогу ў момант руху аўтамабіля і гульні ў непасрэднай блізкасці ад яе.

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

■ Спецыяльны рэпартаж

ПАДЗЯЛІЦЦА ЦЯПЛОМ

Як бяздомным дапамагаюць выжываць у халады

З пачатку студзеня з прычыны моцных маразоў Беларускі Чырвоны Крыж дапамагае найбольш уразлівым катэгорыям. На базе раённых арганізацый ствараюць пункты абаграванння. У абласных гарадах і сталіцы працуюць мабільныя пункты, дзе прапануюць выпіць гарачай гарбаты і паслухаць правілы паводзін пры нізкай тэмпературы. Валанцёры наведваюць таксама найбольш верагодныя месцы знаходжання бяздомных — звалкі, кропкі здачы другаснай сыравіны. Раздаюць неабходныя рэчы і, калі трэба, аказваюць першую дапамогу. Да аднаго з такіх рэйдаў далучыліся і нашы карэспандэнты.

МАТРЫЯРХАТ І ЗАРОБАК ШТОДЗЕНЬ

Мы едзем у невялікім фургончыку, застаўленым пакетамі з прадуктамі і каробкамі з адзеннем. Набліжаемся да Паўночнай звалкі, што пад Мінскам. Вязём дзясятак пакетаў з ежай (цукар, крупы, кансервавы гарошак, тушонка — усё тое, што можа доўга захоўвацца) і столькі ж пакетаў з рэчамі гігіены (туалетная папера, мыла, шампунь). У каробках — цёплыя боты, паліто, коўдры. Гарбаты на гэты раз не будзе.

— Ды ў іх і так ёсць, — кажа пра тутэйшых бяздомных **Ігар СІДАРЭНКА, вядучы спецыяліст па надзвычайных сітуацыях і вышуку Мінскай абласной арганізацыі Чырвонага Крыжа.** — Тым, хто ў горадзе, горш прыходзіцца. Няма дзе гарачай вады дастаць. Ім і гарбата патрэбна, і кіпень, каб «Ролтан» заварыць.

Ад халадоў сталічныя валацугі хаваюцца ў падвалах, на гарышчах шматпавярховікаў. Ці на цеплатрасах. «Дзе і ўчадзьваюць», — дадае валанцёр Сяргей.

Бяздомныя, якія трапілі на звалку, жывуць адносна нядрэнна. Як мінімум могуць зарабіць на пражыццё: сартуюць смецце. За што атрымліваюць каля 10—30 долараў за дзень. Нядрэнны прыбытак! Начуюць у асноўным у закінутых хатах у найбліжэйшай вёсцы. На лёс любяць скардзіцца, але мяняць нічога не збіраюцца. Валанцёры кажуць, што прапаноўвалі некаторым знайсці жыллё, зрабіць дакументы, уладкаваць на працу — адмаўляюцца.

Тут пануе свая іерархія. Матрыярхат, як ні дзіўна. Усім запраўляе адна жанчына. Гуманітарную дапамогу размяркоўвае таксама яна.

— Адзенне неяк перабірала. «Кажух — мне, футра — мне», — узгадвае Ігар. — Мы, вядома, стараліся раздаць кожнаму ў рукі пакет. Прыгразілі, што праз тыдзень праверым. Але разумелі, што, як толькі паедзем, рэчы ўсё роўна ў той жанчыны апынуцца, і яна падзеліць іх, як захоча.

БАРАЦЬБА ЗА КОЎДРЫ

Мы на месцы. Адчыняем машыну. Некалькі чалавек адразу ідуць да нас. «А што вы прывезлі? Валёнкі ёсць? — цікавіцца жанчына за 40. — У маім абутку хадзіць слізка».

Валёнак у машыне не было. Прапануем жанчыне пашукаць што-небудзь іншае ў каробцы з ботамі. «І як вы не мерзнеце? Увесь дзень на вуліцы...» — пытаемся ў яе. «Шмат працую. Калі б на месцы стаяла, даўно адубела б», — неахвотна адказвае Галя.

Разам з Галяй да машыны падцягнуўся яе муж. Атрымалі ад валанцёраў набор для гігіены. Разглядаюць, што ў пакеце.

— Зубная паста. І навошта яна мне? Зубоў усё роўна няма, — незадаволена жанчына.

На заўвагу паводзіць сябе спакайней і не распіхваць прысутных Галя раззлавалася.

— Юра, пайшлі, — заве мужа і кідае пакет у машыну. — Не трэба мне нічога! Я не бедная!

Астатнія насельнікі звалкі паставіліся да гуманітаркі з большым інтарэсам. Прымяралі курткі, разбіралі пакеты з ежай. Найбольшы ажыятаж быў вакол каробкі з коўдрамі.

— Маё! — крыкнула адна з жанчын і ахапіла каробку, не падпускаючы нікога. Потым ужо, калі адабрала некалькі штук для сябе, дазволіла ўзяць астатнія коўдры іншым бяздомным.

Жанчыну з чорным ад сажы тварам, якая так абараняла сваё «багацце», завуць Надзея. На звалцы яна ўжо 16 гадоў. Усе падрабязнасці жыцця жанчына не раскрывае, але кажа, што раней працавала ў ЖЭСе.

— Там заробак затрымлівалі, — скардзіцца новая знаёмая. — А тут кожны дзень грошы плацяць.

На звалку Надзея прыйшла разам з мужам. «Вунь ён, з барадой», — паказвае мне свайго выбранніка. Кім толькі той ні працаваў: і электрашчыкам, і будаўніком. Чаму ён урэшце вырашыў падацца сюды і жонку сваю разам пацягнуў, застаецца толькі здагадвацца.

Сямейная пара тым часам забірае каробку, набітую даверху рэчамі.

— Дзякуй вялікі, — развітваюцца з валанцёрамі. — З Раством Хрыстовым!

«НАМ ДАВЯРАЮЦЬ»

Старажылаў на звалцы хапае. Адзін з мясцовых па мянушцы Смаляк жыве тут больш за 30 гадоў. Кажуць, у яго ёсць жонка і дзеці, якія жывуць у кватэры ў сталіцы. А ён усё роўна прыходзіць працаваць сюды. Падабаецца ні ад каго не залежаць.

— Чаго мне саромецца? — Смаляк спакойна рэагуе на фотакамеру. — Я ж не забіў нікога. Але не хацеў бы, каб жонка мяне такім убачыла.

Валанцёрам з бяздомнымі звычайна лёгка зладзіць. «Яны нас не баяцца. Многія ў начлежку на Ваўпшасава не звяртаюцца, бо там трэба на ўлік станавіцца, даведкі збіраць, — тлумачыць Ігар. — А нам давяраюць».

— Не лянота ў такое надвор'е да бяздомных ездзіць? Ёсць жа і больш прыемная валанцёрская праца...

Добраахвотнікі толькі паціскаюць плячыма: прывыклі.

— Ніхто ж не прымушае. Можаш і ў інфацэнтры застацца, на званкі адказваць. Нам на выездах цікавей. І ўражанні — на ўсё жыццё.

Ігар Сідарэнка сам тры гады быў у Чырвоным Крыжы валанцёрам. А потым перайшоў сюды як на асноўнае месца працы. «Калі звальняўся, у бухгалтэрыі здзівіліся: «І вы на такі заробак ідзяце?» Я ж не дзеля грошай...»

Раздаўшы апошнія пакеты, збіраемся дадому — грэцца. А валанцёры едуць дапамагаць далей. Праўда, ужо не бяздомным, а аўтамабілістам, чые машыны не вытрымалі маразоў і заглохлі на дарозе.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Больш за ўсё бяздомныя цікавіліся коўдрамі і цёплым абуткам.

Сямейная газета

Выпуск № 1 (44)

КАЛІ КАПНУЦЬ ГЛЫБЕЙ...

Шаноўныя чытачы, дзякуй, што застаяцеся з намі ў новым годзе! 2016-ты — высакосны. А значыць (вяршую!) — замест 365 у нас з вамі ажно 366 дзён. А гэта на цэлыя 24 гадзіны больш магчымасцяў для руху і развіцця. Назірання за рухам і развіццём вакол і ўнутры сябе...

За некалькі дзён да новага года нашмат старэйшы знаёмы ўставіў мне палкі ў колы. Пераканана, што зрабіў гэта не са зла. Проста, як нярэдка здараецца, пабаяўся адказнасці, і вырашыў пад шумок перакласці яе на кагосьці іншага. У гэтым выпадку на мяне — слабейшую, маладзейшую. Здаецца, самы просты шлях, але калі капнуць глыбей...

Ніколі не забудуся, як у дзяцінстве зламала маміны акуляры. Вядома, зрабіла гэта не наўмысна. Проста для таго, каб дастаць з паліцы кніжку, мне трэба было залезці на стол. Як на зло, там ляжалі акуляры. Я так спяшалася, што не заўважыла іх. Мама была на працы... У той момант мне стала так страшна, што, каб пазбегнуць адказнасці, я накрыла тыя зламаныя акуляры світарам, паклікала малодшую сястру і папрасіла дастаць кніжку. Яна палезла на стол... Я ж, дачакаўшыся патрэбнага моманту, падбегла, падняла той світар і пераклала адказнасць: маўляў, малая, паглядзі, што ты нарабіла... Наташка — у слёзы... Я ж, замест таго, каб адчуць палёгку, не знаходзіла спакою. Таму, як толькі мама пераступіла парог дома, тут жа прызналася ва ўсім. І вельмі здзівілася, што яна нават не крычала... Цяпер кожны раз, калі мне карціць перакласці адказнасць на некага, згадваю гэтую сітуацыю. Вочы сястры, поўныя слёз... І свае пакуты сумлення, неспакой...

Год таму знаёмая выйшла замуж. Па каханні. Алег старэйшы за Таню на 15 гадоў. Аднойчы ён ужо быў жанаты, мае дваіх дзетак. Развёўся, дарэчы, незадоўга да знаёмства з Таняй. Кажа, былая жонка прамяняла яго на іншага, больш перспектыўнага. Нарадзіла ад яго дзіця. Здавалася б, самы час супакоіцца ды насалоджвацца сваім шчасцем. Дык не. Спачатку яна не дазвалялa Алегу бачыцца з роднымі дзецьмі, настройвала іх супраць таты: «Вось бачыце, вы яму не патрэбны». Таму яму нічога не заставалася, як вырашаць гэтае пытанне праз суд... Затое цяпер дзеці палову часу праводзяць з бацькам. ...Аднойчы, калі Алег прыехаў разам з Таняй забіраць малых на выхадныя, былая жонка яхідна кінула ўслед: «Думаеш, ты ёй патрэбен, а не твае грошы? Паглядзіш, абдзярэ цябе як ліпку і кіне». Знаёмая, калі распавядае пра гэта, толькі ўсміхаецца, жартуе: «Пэўна, па сабе мяркуе». Відаць, нехта б на месцы Тані жадаў у думках зла, магчыма, нават казаў штосьці крыўднае ў адказ ці помсціў неяк па-іншаму. Але яна не з такіх: разумее, што перш чым запэцкаць кагосьці брудам, спачатку прыйдзецца вымазаць свае ўласныя рукі.

Неяк раз адзін чалавек пасварыўся з пастухом і вырашыў зрабіць яму якую-небудзь гадасць. Ну, напрыклад, выкапаць глыбокую яму, каб той у яе ўпаў. Пайшоў на сцежку, па якой звычайна хадзіў пастух, і ўзяўся за рыдлёўку. А пакуль капаў, уяўляў сабе, як пастух упадзе ў яму, магчыма, штосьці сабе зламае. Ці наогул памрэ, не маючы магчымасці адтуль вылезці. Ну ці сама меней у яму ўпадзе яго карова, авечка. Ну ці на благі канец — каза. Ён капаў доўга і ўпарта, марачы пра помсту. І так захапіўся, што не прыкмеціў, як яма становіцца ўсё глыбейшай і глыбейшай. Калі азірнуўся вакол, заўважыў, што выкапаў такую глыбокую пастку, што сам ужо з яе вылезці не зможа. Зусім бы прапаў, калі б той самы пастух крыху пазней яго не выцягнуў. Таму, перш чым нават у думках капаць другому яму, варта ўзгадаць: табе самому прыйдзецца ў ёй апынуцца. Бо першым у яме аказваецца той, хто яе капае.

Надзея ДРЫЛА.

■ Круглы стол

«КУЮ-КУЮ НОЖКУ, ПАЕДУ Ў ДАРОЖКУ...»,

або Як дзецям палюбіць кнігу?

Фота Надзеі БУЖАН.

Калі завітваю пасля працы да сваёй хрэсніцы, не нарадуюся. Ні Юстынка, ні яе старэйшы брацік Янка спаць не пойдуць, пакуль ім не пачытаеш. Кніжку яны самі штовечар выбіраюць са сваёй дзіцячай бібліятэчкі. У апошняй, дарэчы, вельмі шмат беларускамоўных казак. Хочацца, каб як мага болей было такіх сем'яў, якія штодзень чытаюць з дзеткамі. Але рэальнасць пакуль іншая. За маленькага чытача трэба літаральна змагацца, бо ў нашым грамадстве апошнім часам, на жаль, пануе культура спажывання ды камп'ютарных гульняў, а не чытання. Менавіта гэтая праблема была ў цэнтры ўвагі падчас «круглага стала» «Мастацкае слова — падмурак выхавання дзяцей», які нядаўна прайшоў у «Звяздзе».

Надзвычай сімвалічна, што на пачатку Года культуры ў сценах нашай рэдакцыі сабраліся людзі, заклапочаныя станам дзіцячай перыёдыкі і літаратуры, якія лічаць, што з сыходам культуры чытання (а яе трэба прывіваць з калыскі!), можа сысці і сама культура. Сярод іх: галоўны рэдактар дзіцячых часопісаў «Вясёлка»і «Буся», пісьменнік Уладзімір ЛІПСКІ; намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Бярозка», аўтар кніг для дзяцей Генадзь АЎЛАСЕНКА; галоўны рэдактар выдавецтва «Адукацыя і выхаванне» Іван КРУК; метадыст аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі Нацыянальнага інстытута адукацыі Міністэрства адукацыі Беларусі Ірына БУТОРЫНА; дырэктар дзіцячай бібліятэкі імя Васіля Віткі Тамара ПАТУК; старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, пісьменнік Міхась ПАЗНЯКОЎ і пісьменніца Раіса БАРАВІКОВА.

(Заканчэнне на 6 стар. «СГ».)

■ У вас будзе дзіця

Хай мама пачуе...

Кожнаму дзіцяці патрэбна сям'я. Думаю, ніхто не будзе з гэтым спрачацца. Аўтары тэлевізійнай рубрыкі «У вас будзе дзіця», што выходзіць на канале АНТ у рамках праграмы «Пакуль усе дома», выдатна разумеюць гэтую прапісную ісціну. Таму з верай у чарговы цуд працягваюць рабіць вельмі важную справу — дапамагаюць дзецям, якія засталіся без бацькоўскай апекі, адшукаць новыя сем'і. Як вынік — 65 адзінокіх сэрцаў ужо змянілі сцены дзіцячых дамоў на цяпло і ўтульнасць сямейнага ачага. «Звязда» таксама бярэ ўдзел у праекце і працягвае знаёміць сваіх чытачоў з маленькімі героямі рубрыкі, якім трэба адначасова так шмат і так мала — бацькоўскі клопат, пяшчота і любоў.

Наш сённяшні герой жыве ў Андрэеўскім дзіцячым доме, што ў Віцебскай вобласці. Завуць яго Данііла. Хлопчыку не так даўно споўнілася 7 гадоў.

— Данік хоць і жыве ў дзіцячым доме ад нараджэння, вельмі дамашняе дзіця, — расказвае **выхавальніца Людміла ПАДЛЕПКА.** — Ён вельмі пяшчотны, спагадлівы, усмешлівы. Заўсёды прыветлівы. Адзіны яго недахоп, калі гэта можна так назваць: хлопчык не любіць прайграваць.

Летась Данік пайшоў у першы клас, вельмі хваляваўся, чакаў 1 верасня, як вялікае свята. У школе яму падабаецца, там ён сустрэў новых сяброў. Хлопчык сур'ёзна і адказна ставіцца да вучобы.

Данік вельмі творчы хлопчык, любіць марыць, фантазіраваць, вышываць, маляваць, канструяваць. Ён умее гатаваць, дапаможа накрыць стол, нават прыгатаваць святочную вячэру.

Хацелася б, каб у Данілы з'явілася сапраўдная сям'я, дзе б яго любілі. Ён жа, у гэтым няма сумненняў, адкрыта пойдзе на кантакт са сваімі будучымі мамай і татам. Зробіць усё, што ад яго залежыць, каб з'яднаць сваю сям'ю, зрабіць яе яшчэ больш утульнай і гарманічнай. Хочацца, каб мама і тата пачулі, прыйшлі і падарылі яму цеплыню, падтрымку і сямейны ачаг.

Калі вы хочаце даведацца пра Данілу больш, патэлефануйце па нумары (017) 284-71-51 спецыялістам Нацыянальнага цэнтра ўсынаўлення Міністэрства адукацыі. Таксама для тых, хто хоча ўсынавіць дзіця, на сайце videopassport.ru змешчаны відэакурсы, падрыхтаваныя сумесна НЦУ і творчай групай праекта

■ Меркаванне

ТАТА САПРАЎДНЫ І НА ПАПЕРЫ

Праўдзівыя звесткі пра бацькоўства абароняць дзяцей

Абавязковае патрабаванне ўказваць сапраўднае прозвішча рэальнага бацькі пры афармленні пасведчання аб нараджэнні немаўляці павінна з'явіцца ў заканадаўстве Беларусі. Гэты крок павысіць адказнасць за нараджэнне ў мужчын, якія зараз даволі лёгка пагаджаюцца на дзіця па-за межамі сям'і і шлюбу.

А каб стымуляваць да гэтага матуль, **Зінаіда ВАРАБ'ЁВА, загадчыца сектара сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама**, прапануе не прызначаць дэкрэтныя выплаты, пакуль у адпаведную графу дакумента не будуць упісаны дакладныя звесткі пра бацьку, а не нейкае імя са слоў жанчыны.

Каб мацярынства было свядомым і не было непатрэбных дзяцей; каб малыя былі абароненымі, нараджаліся ў любові і былі жаданымі; каб ведалі сваіх бабуль і дзядуль, трэба адважыцца на такі крок, упэўнена спецыяліст.

— У дзіцяці павінны быць маці і бацька, каб яно было шчаслівым, маці нельга ганарыцца тым, што яна «нарадзіла для сябе», — адзначыла Зінаіда Вараб'ёва. *— Потым узнікаюць пытанні яе нездольнасці правільна выхаваць дзіця, у якога няма перад вачыма бацькоўскага прыкладу, далей з'яўляюцца праблемы падлеткавага перыяду.*

Асмельваючыся на дзіця, трэба перш за ўсё думаць пра яго патрэбы, каб яно не пакутавала ад недакладнага заканадаўства. Так, сапраўдны запіс пра бацькоўства дазволіць у будучыні спагнаць аліменты, альбо да таты можна будзе звярнуцца, калі, не дай Бог, нешта здарыцца з маці.

— Калі мужчына, чыё імя ўказана ў графе «бацька», захоча адмовіцца ад дзіцяці і даказаць, што яно не яго, няхай робіць гэта праз суд з аплатай працэдуры ўстанаўлення бацькоўства. Колькіх праблем маглі б пазбегнуць дзеці, калі б мужчына ўтрымліваў і тых малых, што нарадзіліся ў яго па-за шлюбам! Чым больш грошай выдаткаваны на немаўля, тым лепш для яго, — упэўнена прадстаўніца Мінгарвыканкама. *— З іншага боку, ёсць матулі, якія не дапускаюць тату да дзіцяці і кажуць, што выхаваюць яго самі, а бацька ім не патрэбен. Табе не патрэбен — дык дзіцяці патрэбен! Нават калі малое проста ведае свайго тату, з якім не жыве разам, але мае пэўныя стасункі, гэта ўжо падстава, каб усе навакольныя ведалі, што бацька ў яго ёсць!*

Ірына СІДАРОК

■ (Ня)шчасце ў метрах

КАЛІ ЖЫВЕШ НА ТРОХ «КВАДРАТАХ»...

«Звязда» разбіралася, чаму сям'і не пашыраюць жылплошчу

— Тут дзіцячы ложак стаіць, канапа, раскладное крэсла, тумбачка, шафа і камп'ютарны стол. Калі канапа раскладваецца, у мяне застаецца менш за паўкрока прасторы, — расказвае Аляксандр Бандаровіч. Пералічаныя рэчы займаюць увесь інтэрнатны пакойчык плошчай менш за 12 квадратных метраў, дзе жывуць чацвёра. Атрымліваецца менш за тры «квадраты» на чалавека... Кожны дзень сям'я Бандаровіч вымушана есці, спаць, бавіць час, рабіць урокі, тулячыся ў адным маленькім памяшканні, прадастаўленым Мінскім заводам аўтаматычных ліній. Ужо хутка год, як яны спрабуюць «выбіць» належныя ёй «метры», але паразуменне з кіраўніцтвам завода знайсці не атрымліваецца.

Фота Максіма ТАРНАЛІЦКАГА, onliner.by

Пакой, дзе жыве сям'я Бандаровіч. Цяпер тут стаіць яшчэ і дзіцячы ложак.

«Бярыце, што даюць, або здымайце кватэру!»

Ірына Бандаровіч больш за 13 гадоў адпрацавала на МЗАЛ. У 2007 годзе яна, маючы дзіця ад першага шлюбу, падала заяву на пашырэнне жылплошчы. Але на той момант на жанчыну з дзіцем прыпадала якраз па 6 належных на чалавека «квадратаў».

Мінулай зімой Ірына пабралася шлюбам з Аляксандрам, і з сакавіка сям'я спрабуе палепшыць жыллёвыя ўмовы. Некалькі разоў падавалі дакументы ў жыллёвую камісію, а замест адказу атрымалі пытанне: а на якой падставе Аляксандру не выдзяляе жылплошчу трактарны завод, на якім мужчына працуе?

— А пры чым тут трактарны завод, калі я для сябе і дзяцей гэтае жыллё выбіваю? Я ж стаю на чарзе, пры чым тут муж? Раптам я з ім жыць не буду, калі так меркаваць? — запытваецца Ірына.

Аляксандр тлумачыць, што ён таксама стаў на чаргу на сваім прадпрыемстве, але, па-першае, працуе ён там не так даўно, а па-другое, яго імя значыцца 568-м у агульным спісе ахвотнікаў атрымаць пакой.

Калі адбылося новае пасяджэнне жыллёвай камісіі, адмову ў пашырэнні плошчы патлумачылі адсутнасцю ў інтэрнаце вольных блокаў.

— Блокі тут ёсць, але яны з'яўляюцца жыллём для тых, хто працуе ў адміністрацыі, і іх набліжаных, — мяркуе Аляксандр. Ён расказвае, што ў іх блоку ў суседнім пакоі на такой жа плошчы жыве адна жанчына.

Пасля чарговай адмовы ў пашырэнні сям'я звярнулася ў адміністрацыю Партызанскага раёна сталіцы. Адтуль таксама неаднаразова адпраўлялі запыты на завод, падключылі нават кіраўніка адміністрацыі Дзяніса Аўсяннікава, які ад свайго імя прасіў выдзеліць сям'і блок. Аднак і гэта аказалася безвыніковым.

Дайшлі да пракуратуры

У верасні ў Бандаровічаў нарадзіўся яшчэ адзін сын, і плошчы ў пакойчыку катастрафічна стала не хапаць. Нарэшце ім прапанавалі пакой у 18 квадратных метраў у іншым інтэрнаце на вуліцы Батанічнай.

— Мы прыехалі паглядзець той пакой, убачылі, што ён у крытычным стане — там правады тырчаць са сцен, шпалеры і падлога абадраныя. У тым пакоі чалавек павесіўся. А калі МНС з праверкай туды прыехала, выпісала штраф, — расказвае Аляксандр. — Калі мы прыехалі на завод і спыталі ў начальніка аддзела кадраў: «Што вы нам прапануеце?», нам каротка адказалі: «Бярыце, што даюць, або здымайце кватэру!»

— Як мне патлумачылі ў федэрацыі прафсаюзаў, нас не маюць права перасяляць у іншае месца, калі ёсць жыллё ў нашым інтэрнаце, — заўважае Ірына.

Апроч таго, па нормах прапанаванага памяшкання таксама было недастаткова: чатыры чалавекі павінны жыць на 24 метрах. У якасці кампрамісу сям'і прапанавалі два пакоі па 18 метраў, аднак тады атрымліваецца, што за лішнюю плошчу таксама трэба плаціць. Да таго ж Аляксандр з Ірынай не хочуць пераязджаць у іншы інтэрнат: тут увесь рамонт зроблены рукамі жонкі, старэйшы сын ходзіць у школу, малодшага запісалі ў садок...

Яшчэ адна праблема ў тым, што дырэктар завода адмаўляецца ўключаць Аляксандра ў склад сям'і Ірыны. Вось такі парадокс: штамп у пашпарце ёсць, дзіця ёсць, а ў сям'ю чалавек не ўваходзіць!

Фота Надзеі БУЖАН.

Гэтае памяшканне прапанавалі сям'і ў інтэрнаце на Батанічнай.

У Бандаровічаў сталі ўзнікаць канфлікты з суседзямі: маўляў, тыя не хочуць прыбірацца ў блоку, і ўсё даводзіцца рабіць Ірыне, нават падчас цяжарнасці яна наводзіла чысціню адна. Гэта дайшло да заводскага аддзела кадраў, і цяпер адмову ўключаць Аляксандра ў дагавор найму і выдзяляць яму жылплошчу матывуюць тым, што ён сварыцца з суседзямі.

— Загадчыца інтэрната мне ўвогуле аднойчы сказала, што мае права трымаць мяне тут да дзесяці гадзін, а пасля — да пабачэння, — абураецца Аляксандр.

Тады мужчына звярнуўся да ўчастковага, і той растлумачыў, што ён мае права пражываць на плошчы сваёй жонкі, пры гэтым можа быць зарэгістраваны дзе заўгодна.

Дарэчы, нованароджанага сына Ірыны і Аляксандра таксама дагэтуль не зарэгістравалі ў інтэрнаце — дакументы ўжо чатыры месяцы ляжаць на стале дырэктара без подпісу.

Сям'я ўжо дайшла да пракуратуры і Міністэрства прамысловасці. Цяпер пракуратура праводзіць праверку, і міністэрства чакае яе вынікаў.

— У мяне апошняя інстанцыя — суд, таму што гэту беззаконнасць трэба спыняць.

«Трэба жыць па законе»

«Звязда» не магла прадставіць сітуацыю аднабакова і звянулася па каментар на завод. Вось што нам расказаў **намеснік дырэктара МЗАЛ па ідэалагічнай працы Ягор ЖУРАЎ:**

— У іншым інтэрнаце мы выдзелілі пакой плошчай у 18 квадратных метраў для сям'і з трох чалавек, як было ўказана ў заяве. Ніякіх кепскіх умоў там няма, ён адрамантаваны, са шклопакетамі, шпалерамі, добрае памяшканне. Яны (Бандаровічы. — **Аўт.**) настойваюць на цэлым блоку там, дзе цяпер пражываюць, але такой магчымасці пакуль няма. Я не буду, як яны прапануюць, высяляць з блока людзей, каб засяліць іх.

— Але ж кажуць, што за стан пакоя ў іншым інтэрнаце МНС выпісала штраф?

— Гэта не за той пакой, — заяўляе намеснік дырэктарара і ў той жа час запэўнівае, што ўвесь інтэрнат добры. (Але, выходзіць, усё ж ёсць у ім нешта ў нездавальняючым стане?)

— Мы нават стварылі спецыяльную камісію, якая з'ездзіла, паглядзела тое памяшканне, зацвердзіла, — працягвае суразмоўца. — Але сям'я пастаянна нечым незадаволеная. Вы можаце самі з'ездзіць паглядзець пакой 6А, які мы прадаставілі сям'і Бандаровіч. Добры інтэрнат, там жывуць нашы начальнікі.

Старшыня Партызанскага раённага аб'яднання арганізацый прафсаюзаў г. Мінска Святлана КУПЦОВА:

— Сітуацыя такая, што наймальнік чамусьці адмаўляецца рэгістраваць мужа Бандаровіч, хоць ён абавязаны гэта зрабіць, мы ўсе дакументы праверылі. І пашыраць жылплошчу таксама адмаўляецца — але ж трэба жыць па законе!

На кіраўніка прадпрыемства ўжо і штраф МНС накладала, і ў адміністрацыю яго выклікалі, ён усё адно робіць тое, што хоча. Сям'і Бандаровіч прапанавалі пакой у інтэрнаце на Батанічнай, але ён быў у неналежным стане, там умовы горшыя, і Ірына напісала афіцыйную адмову ад яго. А кіраўніцтва па метражы быццам бы пытанне вырашыла, а па сутнасці — не. Я напісала на адрас дырэктара афіцыйную паперу, што праблема застаецца нявырашанай. Цяпер ідзе праверка пракуратуры, і яшчэ чакаем адказ ад жыллёвай камісіі. Хоць апошняя так рэагуе на запыты: некаторыя ўвогуле выкідае.

Ад прапановы мы адмовіцца не змаглі і паехалі ў інтэрнат на вуліцы Батанічнай. Тым больш што той пакой, дзе цяпер жыве сям'я Бандаровіч, Аляксандр папрасіў не фатаграфаваць: аднойчы туды ўжо прыязджалі журналісты, і, паводле яго слоў, пасля выхаду матэрыялу праходзіць да Бандаровічаў з камерай забаранілі.

Нас сустракае **загадчыца інтэрната Вольга САБІНСКАЯ** і паказвае сваю «вотчыну» — актавую залу, пакой школьніка, дзіцячы, заводзіць у агульную кухню, дазваляе нават сфатаграфаваць прыбіральню і расказвае, што патроху ў інтэрнаце робіцца рамонт. Затым загадчыца паказвае той самы пакой 6А плошчай 18,5 квадратнага метра, які нібыта прапаноўвалі сям'і Бандаровіч. Памяшканне са шклопакетамі, просценькімі шпалерамі на сценах і «лямпачкай Ільіча» выглядае не тое, каб на катэгорыю «люкс», але і непрыдатным для жыцця яго не назавеш.

Вось такі парадокс: штамп у пашпарце ёсць, дзіця ёсць, а ў сям'ю чалавек не ўваходзіць!

— У адміністрацыі раёна паведамілі, што МНС наклала штраф на дырэктара завода за стан вашага інтэрната...

— Ведаеце, да чаго прычапіліся? Да таго, што ў мяне кветка замінала падысці да пажарнай скрыні. Я зрабіла часовую ілюмінацыю, правяла провад і туды паклала. Мне сказалі прыбраць — і я прыбрала. Ну і не былі пранумараваныя пажарныя скрыні.

Не пацвердзіла Вольга Сабінская і інфармацыю, што інтэрнат перадаюць Мінгазу (пра гэта карэспандэнту «Звязды» распавёў Аляксандр Бандаровіч праз нейкі час пасля сустрэчы).

— Суседні інтэрнат перадаюць, не наш, — запэўніла загадчыца.

Затое гісторыю пра тое, што ў інтэрнаце павесіўся чалавек, Вольга Анатолеўна не стала адмаўляць. Але, паводле яе слоў, гэта здарылася не ў тым пакоі, які прапаноўвалі Бандаровічам.

— Магчыма, Бандаровічаў засмучае, што ў іх блочная сістэма, там свой туалет, а ў нас кухня, рукамыйнік і прыбіральня агульныя, — гаворыць Вольга Сабінская.

Па яе словах, сям'я не прыязджала глядзець прапанаваны пакой.

Ва ўсёй гэтай гісторыі зразумела адно: як заўсёды, абодва канфліктуючыя бакі імкнуцца перацягнуць коўдру на свой бок. Але калі б у гэтай сітуацыі вяршэнстваваў закон, то і канфлікту ніякага не было б.

Дзіяна СЕРАДЗЮК.

seradzyuk@zviazda.by

■ Азбука адносін

5 МОЎ КАХАННЯ

Вы стараецеся паказаць сваёй палавінцы, што кахаеце яе, а яна раздражняецца? Камяк незадавальнення расце з кожным днём? Можа быць, вы проста размаўляеце на розных мовах? Магчыма, ваш муж хоча, каб яго пахвалілі, а вы замест гэтага гатуеце смачную вячэру. Магчыма, вашай жонцы хочацца праводзіць з вамі пабольш часу, а шыкоўныя букеты, якія вы дорыце кожны вечар, ёй не патрэбны. «Я ўпэўнены, што як толькі вы вызначыце асноўную мову кахання вашага мужа (жонкі) і навучыцеся гаварыць на ёй, вы знойдзеце ключ да доўгіх, гарманічных адносін», — упэўнены Гэры Чэпмен, доктар філасофіі, які не першы год працуе з сямейнымі парамі. Ён вылучае пяць моў кахання: словы адабрэння; час; падарункі; дапамога; дотыкі.

Словы адабрэння

Пахвала — гэта адзін са спосабаў выказаць любоў словамі. Але не карыстайцеся ёй, каб дабіцца свайго. Гэта ўжо не каханне, а маніпуляванне. Хваліце вашага мужа (жонку), каб даставіць яму (ёй) радасць.

Іншы дыялект гэтай мовы — словы, якія ўзбадзёрваюць. «Узбадзёрваць» — значыць надаваць упэўненасці, натхняць. Магчыма, ваш муж чакае, каб вы падтрымалі, ухвалілі яго выбар. Магчыма, ваша жонка хоча пайсці на курсы, каб развіць свае здольнасці. Вашы словы дапамогуць блізкаму чалавеку зрабіць першы крок і падтрымаюць у хвіліны сумненняў.

Магчыма, гэтая мова чужая для вас, і, каб авалодаць ёй, патрабуецца шмат сіл і цярпення. Асабліва калі вы прызвычаіліся крытыкаваць і асуджаць.

Час

Галоўнае для таго, хто гаворыць на мове часу — быць разам з мужам (жонкай). Не проста побач, а праяўляць увагу адно да аднаго. Калі тата, седзячы на падлозе, гуляе ў мяч з двухгадовым сынам, яго ўвага прыкавана да дзіцяці, і яны разам. Калі ж, качаючы мяч, бацька размаўляе па тэлефоне, яго ўвага рассеяная.

Некаторыя лічаць, што разам бавяць час, хоць на самой справе проста жывуць пад адным дахам. Муж, які размаўляе з жонкай і адначасова глядзіць у манітор, не ўдзяляе ёй часу, бо не ёй належыць яго ўвага. Бавіць час разам — значыць мець агульную справу, занятак, і рабіць гэта з задавальненнем. Гэта значыць, выключыць тэлевізар, глядзець адно на аднаго і размаўляць, цалкам засяродзіўшыся на суразмоўцы. Вы заўважалі, што ў рэстаране амаль заўсёды можна адрозніць жанатую пару ад нежанатай? Закаханыя не зводзяць вачэй адно з аднаго і размаўляюць. Муж і жонка глядзяць па баках. Можна падумаць, яны прыйшлі паесці!

Калі вы з мужам сядзіце побач і размаўляеце дваццаць хвілін, вы дорыце адно аднаму дваццаць хвілін жыцця. У гэтым праяўляецца каханне. Калі час — родная мова вашай палавінкі, такія размовы неабходныя, каб яна адчула, што вы яе кахаеце. Прывучыцеся размаўляць па душах. Няхай кожны раскажа пра тры здарэнні, якія здарыліся за дзень, і падзеліцца свайімі пачуццямі. Калі вы чымсьці займаецеся разам, у вас з'яўляюцца агульныя ўспаміны. Шчаслівыя муж і жонка, якім ёсць што ўзгадаць!

Падарункі

Падарунак можна ўзяць у рукі і сказаць: «Ён падумаў пра мяне» ці «Яна пра мяне ўспомніла». Падарунак — сімвал гэтай думкі. Няважна, колькі грошай вы патрацілі: сімвалы маюць эмацыйную каштоўнасць. Калі здаралася, вашы знакі ўвагі не падабаліся, калі дагадзіць іншаму цяжка, тады ён дакладна не гаворыць на мове падарункаў. У чалавека, мова кахання якога — падарункі, ад гэтых знакаў увагі свецяцца вочы.

Але і быць побач з мужам (жонкай) у цяжкія хвіліны (напрыклад, пры абароне дысертацыі, родах ці страце блізкіх) — найлепшае з таго, што вы можаце падарыць яму (ёй), вы самі робіцеся сімвалам кахання. Калі ж вам патрэбна, каб блізкі чалавек быў побач, папрасіце яго пра гэта. Ніколі не чакайце, што ён прачытае вашыя думкі. А калі вас просяць: «Калі ласка, пабудзь сёння са мной», пастаўцеся да гэтай просьбы сур'ёзна, нават калі вам гэта здасца капрызам. Вашую адмову могуць вытлумачыць зусім нечакана.

Дапамога

Што можна зрабіць? Прыгатаваць абед, накрыць на стол, памыць посуд, прыбраць кватэру, навесці парадак у шафе, прачысціць ракавіну, працерці люстэрка ў ваннай, памыць машыну, вынесці смецце, змяніць дзіцяці падгузкі, пераклеіць шпалеры, выцерці пыл з шафы, пагуляць з сабакам, памяняць ваду ў акварыуме і напаўняльнік для коткі. Гэта дапамога. Яна патрабуе часу, сіл. І калі вы з радасцю дапамагаеце мужу (жонцы), вы выказваеце каханне.

Калі да вяселля ваш спадарожнік робіць штосьці для вас, гэта зусім не сведчыць, што ён будзе гэта рабіць і пасля. Каханне — гэта дар і... намаганне. Тут патрабаваць нельга, можна толькі прасіць. Запішыце свае просьбы. Напрыклад, што жонка павінна зрабіць да вяртання мужа, каб ён адчуў яе каханне? Тое ж самае і жонка. Складзіце спіс з чатырох пунктаў. Магчыма, каб вывучыць мову дапамогі, вам давядзецца змяніць звыклыя ўяўленні пра тое, што ў сям'і робіць мужчына, а што — жанчына. Адмоўцеся ад стэрэатыпаў. Каханне важнейшае!

Дотыкі

Калі ваш муж (жонка) размаўляе на гэтай мове, дотыкам ён паверыць хутчэй, чым словам «Я цябе кахаю». Вы павінны дакранацца да яго так, як яму падабаецца. Магчыма, некаторыя дотыкі яму непрыемныя. І калі ён гаворыць вам пра гэта, пастарайцеся іх пазбягаць, інакш ужо не каханне праявіце. Гэта будзе азначаць, што вы клапоціцеся толькі пра сябе, а ён вам абыякавы. Памылкай было б лічыць, што тое, што падабаецца вам, прыемна і яму.

Калі ваш спадарожнік размаўляе на гэтай мове, вы павінны трымацца за рукі, рабіць яму масаж, абдымаць яго, цалаваць, гладзіць па валасах. Для яго важная любая пяшчота, тады ён адчуе ваша каханне.

Палавая цяга ў мужчын стымулюецца ў тым ліку і ўтварэннем семянной вадкасці. У жанчыны ж яна заснавана пераважна на пачуццях, а не на фізіялогіі. Калі жонка адчувае, што муж кахае і цэніць яе, яна хоча з ім фізічнай блізкасці. Калі эмацыйнай блізкасці няма, яна часта не імкнецца і да фізічнай. Калі муж і жонка знайшлі агульную мову, калі іх «пасудзіны кахання» поўныя, наладжваюцца і інтымныя адносіны. Інтымныя праблемы амаль заўсёды пачынаюцца там, дзе не задаволены эмацыйныя патрэбы.

* * *

А вы знайшлі агульную мову са сваёй палавінкай? На якой мове размаўляеце самі? Калі вы адчуваеце, што вас кахаюць? Чаго хочацца вам? Калі вам складана адказаць на гэтыя пытанні, паспрабуем ад адваротнага. Што вас найбольш раніць? Узгадайце, пра што вы часцей за ўсё прасілі мужа (жонку)? Вашы просьбы, хутчэй за ўсё, маюць адносіны да роднай для вас мовы. Блізкі чалавек мог успрымаць іх як нешчыра. Вы ж прасілі пра каханне. Падумайце, як вы самі звычайна выказваеце свае пачуцці, што робіце. Верагодна, таго ж вы чакаеце ў адказ. І наадварот, крытычныя словы вашай палавінкі дапамагаюць вызначыць яго (яе) родную мову кахання. Калі вы не задавальняеце базавыя патрэбы мужа (жонкі), ён абураецца гучней за ўсё. Крытыка — спосаб прасіць пра каханне. Хоць і не найлепшы. Калі вы разумееце гэта, успрымайце крытыку як інфармацыю.

Падрыхтавала Ганна МАЛЧАНАВА.

■

■ Вазьму твой боль...

У СТАСУНКАХ З ГРАШЫМА

Дабрачынны рух «Клуб 5000», як і любы дабрачынны рух, перыядычна вінавацяць у няправільным размеркаванні сродкаў. Кожнаму здаецца, што ён зрабіў бы лепш, больш справядліва, рацыянальна...

Найчасцей прэтэнзіі гучаць ад бацькоў хворых дзетак. Пакрыўджаных, стомленых, ваяўнічых. Любой маці, якая з апошніх сіл вядзе барацьбу за сваё дзіця, здаецца, што ў іншых патрэбы меншыя. Гэта яе крывіначка пакутуе ад прыступаў, не спіць начамі і хоча проста жыць. А «псеўдафонды», «несвядомыя валанцёры» разбазарваюць сродкі на неістотнае.

Шмат гадоў таму я мела размову з Вольгай, маці хлопчыка, хворага на ДЦП. Яна вазіла яго на курсы рэабілітацыі за мяжу. У зборы сродкаў дапамагаў дабрачынны фонд, якім тады кіравала мая знаёмая. І вось калі сума была амаль сабраная і яшчэ знаходзілася на рахунках фонду, Вольга радасна падзялілася ў інтэрнэце, што грошы на наступны курс знайшліся, квіткі ўжо набытыя і заўтра яна з сынам вылятае на рэабілітацыю. Кіраўнік фонду даведваецца пра гэта з сецівa, вінаваціць маці ў падмане і пазбаўляе хлопчыка сабраных сродкаў і далейшых стасункаў з фондам.

Ну сталася так, што грошы для хлопчыка прыйшлі з іншай крыніцы. Ці варта вінаваціць няшчасную маці толькі за тое, што яна перастрахоўвалася? Ці ёсць яе віна ў тым, што шукала паратунак з розных бакоў і біла ва ўсе званы? Наўрад ці гэта можна расцаніць як падман. Не думаю, што Вольга магла патраціць лішнія сродкі бязглузда. Працэс рэабілітацыі вельмі доўгі, і ўжо сёння яна думае пра наступны курс і сродкі на яго.

Карацей, я была на баку маці і палічыла паводзіны сваёй знаёмай надта рэзкімі і імпульсіўнымі. За шэсць гадоў кіравання дабрачынным рухам мне адкрыліся нябачныя тады прычыны такіх паводзін. Я не апраўдваю, але пачынаю разумець яе.

Кожная маці ўнутры свайго гора. Яна бачыць вакол такіх жа матуль-ваўчыц, што за карак выцягваюць сваіх немаўлят з багны. Яна спачувае ім, падзяляе іх гора, у нечым разумее і нават атаясамлівае сябе з імі. Але ў яе сваё балота. У кожнай маці-ваўчыцы сваё балота.

Валанцёры і дабрачынцы назіраюць збоку. Кожнае балота мы бачым на аднолькавай адлегласці. Мы чытаем іх лісты, просьбы, маленні. І кожны раз праходзім стадыю адчаю і ўласнага бяссілля. Мы разрываемся паміж усімі і марым дапамагчы кожнаму. А потым, адгараваўшы, бяром сябе ў рукі і пачынаем думаць. Думаць рацыянальна. Улічваць кожны рубель і адказваць за кожную капейку. І ты адчуваеш, як даючы аднаму, забіраеш у іншага. Але трэба рабіць выбар.

Мы не можам імгненна сабраць сто пяцьдзясят тысяч долараў на аперацыю. Але можам правесці каналізацыю ў вясковую хату падапечнай. Гэтае дзяўчо нядаўна змагалася за сваё жыццё. І тады была адна мэта — выжыць. Ёй пашчасціла, і цяперашнія задачы адпавядаюць сітуацыі. Чалавек — ненасытная істота: дасягае аднаго, самага запаветнага, і яму зноў патрэбна нешта новае. Ніколі не забуду словы калегі з грамадскага аб'яднання «Дзеці ў бядзе»: «Калі мы дазволілі ім выжыць, мы павінны даць ім магчымасць жыць».

Уладкаваць іх новае жыццё, аблегчыць вяртанне з хваробы, сацыялізаваць, падтрымаць — таксама наша задача. І калі яшчэ ўчора ля бальнічнага ложка маці прасіла толькі здароўя сыну, то сёння самае страшнае для яе — зімні абутак. І гэтая праблема такая ж вострая, як і папярэдняя. Матуля пакутуе ад таго, што не можа вырашыць яе самастойна. Змяніліся рэаліі, умовы і патрэбы, але пачуцці засталіся. Яна адчувае безвыходнасць і бяссілле перад босым сынам, як калісьці перад бальнічным ложкам.

Для спонсараў самым важным здаюцца лекі. Яны з радасцю і гонарам гатовыя траціць вялікія сумы на дарагія прэпараты. Ім трэба адчуць сябе магутнымі, добрымі, важна разумець, што ты зрабіў нешта выдатнае — выратаваў жыццё. Гэта не на ноўтбук патраціць. Так уласная важнасць выглядае яшчэ важней.

А я не стамляюся прыводзіць прыклад Дзімы. Яму тэрмінова былі патрэбны даражэзныя замежныя лекі. І набліжаўся яго дзень нараджэння. Хлопчык марыў пра квадрацыкл. Дарагі падарунак. Нам прыйшлося выбіраць: лекі ці машына. Разам з яго маці мы выбралі другое. Можаце сабе ўявіць, што адчувалі суседзі па палаце, якім не хапала на аперацыю за мяжой, на блок хіміятэрапіі?.. У іх не было ўпэўненасці ў заўтрашнім дні, а мы «разбазарвалі» істотную суму!

Лекі для Дзімкі таксама купілі: як бывае, з іншых крыніц. Але яны яму не спатрэбіліся. Гэта быў апошні дзень нараджэння. І яго маці бясконца ўдзячная за «разбазарванне» сродкаў. Тады для яе самым вялікім жаданнем, за любыя грошы, была ўсмешка сына. А ён усміхаўся, як жа ён усміхаўся на тым квадрацыкле!..

Ніколі не забуду словы калегі з грамадскага аб'яднання «Дзеці ў бядзе»: «Калі мы дазволілі ім выжыць, мы павінны даць ім магчымасць жыць».

Матэрыяльную дапамогу падапечным «Клуба 5000» мы размяркоўваем разам, з удзелам мноства валанцёраў. Раз на месяц вывучаем бягучую сітуацыю і навіны ўсіх падапечных. У адных мяняюцца пратаколы, лекі, сумы, патрэбы, адмяняюцца паездкі, зрываюцца блокі, іншыя выходзяць у рэмісію. А бывае, як і ў хлопчыка з ДЦП, — дапамога прыходзіць з іншай крыніцы.

На разведку, абмеркаванні, падлікі і ваганні ідзе не адзін дзень, а часам не адзін тыдзень. Рашэнні даюцца нялёгка. Страшна зрабіць памылку, бо яна можа стаць фатальнай. І менш за ўсё хочацца кагосьці пакрыўдзіць.

Я памятаю, як аднойчы, у часы маёй татальнай беднасці, знаёмы папрасіў заскочыць у банк і абмяняць яму вялікую суму валюты на айчынныя рублі. Ён спяшаўся і сам не паспяваў адстаяць чаргу. Памятаю гэта адчуванне — я ніколі ў жыцці не трымала ў руках столькі грошай адразу. Мяне перапаўняла... упэўненасць. Так, істотныя сумы надаюць упэўненасці не толькі матулям хворых дзетак. Нам усім патрэбны грошы. Для ўпэўненасці. У сабе, у заўтрашнім дні.

Зусім іншыя пачуцці ў мяне выклікаюць грошы, сабраныя на дапамогу падапечным «Клуба 5000». Я раскладаю іх стосамі, як карты, пералічваю, як фанцікі. Трымаючы ў руках вялікія сумы, я ніколі не спакушалася думкай «на іх можна было б купіць...» Настолькі не ўспрымаю гэтыя грошы грашыма, што, збіраючыся ў банк, дзясяткі мільёнаў рублёў і тысячы долараў закідваю ў празрысты файлік разам з васьмю лістамі дабрачынных рэквізітаў. І выходжу за дзверы з файлікам у руках. Дбайны муж спыняе на парозе, уручае сумку, пакуе файлік у патаемную кішэню і прапануе суправаджэнне: з такімі сумамі па вуліцы страшна хадзіць. А мне не страшна, бо я не адчуваю, што гэтыя паперкі — грошы. Магчыма, я проста не адчуваю ўпэўненасці. Упэўненасці, што правільна зразумела патрэбы і аб'ектыўна размеркавала сумы. Упэўненасці, што кагосьці не пакрыўджу. І, нарэшце, упэўненасці, што грошы могуць тварыць цуды.

Таццяна НЕМЧАНІНАВА,
заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»

■

ДАЛЁКА І БЛІЗКА

Да канца студзеня ў Музеі гісторыі беларускага кіно (на Свярдлова, 4 у Мінску) прапануецца «Гульня ў класіку» — міжнародная выстава пінхол-фота. Што гэта такое? Pinhole — адтулінка, зробленая шпількай. Значыць, гэта фотаздымак, створаны камерай без лінзаў, калі замест аб'ектыва выкарыстоўваецца малюсенькая адтулінка. Кажуць, атрымліваецца бясконца глыбока (калі гаварыць пра рэзкасць) і вельмі атмасферна (гэта ўжо пра настрой). Кажуць, пінхол размывае межы часу, а недахопы ператварае ў вартасці. Хочаце ў гэтым пераканацца?

Што такое каляндар? Гэта пазыковая кніга. Праўда-праўда. Першыя дні ўсіх месяцаў рымляне называлі календамі і пазначалі асаблівым чынам — каб не забыцца заплаціць працэнт з пазыкі. Увогуле, календары бываюць розныя. А якімі яны былі раней? Пра гэта расказвае выстаўка «Кола дзён», якая ажно да канца першай дэкады лютага экспануецца ў Музеі беларускага кнігадрукавання ў Полацку.

Да 24 студзеня Бабруйск пачуваецца перамешчаным на чатыры стагоддзі назад. Прынамсі, тая частка горада, якая называецца краязнаўчым музеем. Тут з традыцыйнага свята Трох каралёў зноў пачаўся зімовы кірмаш. Вы можаце далучыцца — прыняць удзел у касцюмаванай дзеі «Калі Бабруйск быў каралеўскім». Падзеліцеся пасля ўражаннямі?

Вы яшчэ не бралі ўдзел у аранжавых баталіях, якія штогод ладзяцца ў італьянскім горадзе Іўрэя? Вам будзе дазволена кідацца апельсінамі толькі пасля таго, як вы начэпіце на галаву аранжавую шапку. А ўсё з-за таго, што восем стагоддзяў таму дачка млынара Віялета адмовіла ў каханні герцагу і адрэзала яму галаву. І цяпер кожны, хто спачувае гэтай дзяўчыне, павінен у пэўны тэрмін на пачатку лютага прамаўляць фразу «Убачымся ў Тлусты аўторак а першай» — і рыхтаваць апельсіны да бітвы. Вы жадаеце?

Да самага Вадохрышча — ГУМ-кірмаш на Краснай плошчы ў Маскве. Прапануюцца: смачная ежа (блінцы з ікрой, смятанай і маслам, бульба з гуркамі і грыбамі, грыльказаўбаскі, венскія вафлі, смажаныя каштаны...), напоі (глінтвейн, імбірная гарбата, збіцень...), сувеніры (жостаўскія падносы, хахламскія цацкі, аранбургскія хусткі, тульскія пернікі), відовішчы (танцоры і музыкі, клоўны і фокуснікі).

Icehotel — ледзяны гатэль у Юкасярві ў Швецыі выдае рэкамендацыі і падказкі ўсім, хто не ведае, як заснуць, калі ў паветры пануе ўстойлівы «мінус». Хочаце прыняць удзел у «эфемерным арт-праекце»? Атэль пабудаваны з лёду (г.зн., з лёду складзены будуць сцены вашага нумара, а таксама падлога і столь). Пальчаткі і вопратка будуць выдадзены, як і сам нумар, за грошы.

СТАЛІЧНЫ КВЭСТ

Нават для сталічнага жыхара гэтае падарожжа з'яўляецца падарожжам у прамым сэнсе — ад слова «дарога». Запіўшы кавай традыцыйны бутэрброд, ён выйдзе ранкам з дому і накіруецца ў бок старога гандлёвага тракта. Куды? Наўпрост да княжацкага ложа. З гэтага моманту і пачнуцца загадкі. Гандлёвы тракт — што гэта? А княжацкае ложа?



Усё апісанае тут адбудзецца пад вось гэтай мансардай, у дзень, калі вы пажадаеце прасякнуцца новай «падарожнай гісторыяй».

Пра месца гэтае, шырока раскінутае ў самым звычайным кутку сталіцы, гаворыцца і пішацца шмат, але спрэс аднастайна: там і сям друкуюцца і пераказваюцца авантурныя гісторыйкі пра ўладальнікаў сядзібы, жудасныя аповеды пра свінцовую труну ў сямейнай капліцы, нязграбныя легенды пра недарэчныя здані, што блукаюць па парку... А ўладальнікі, між тым, разумна вядуць вялікую гаспадарку з млынам і вінакурняй ды прымаюць гасцей у прыгожым палацыку, залы якога, аздобленыя з пэўным густам, дэманструюць вялікія фінансавыя магчымасці. Вунь у адным з прасценкаў у пярэднім пакоі стаіць буфецік-вітрына. Думаеце, так сабе? Не. Па ўсім відаць, буфецік гэты створаны паводле эскіза Фёдара Шэхтэля і выраблены на фабрыцы Хаіма Разенберга. Вы ведаеце Шэхтэля? Выключны дойлід і архітэктар, выкладаў кампазіцыю ў «Строганаўцы». А Хаім Разенберг — радня Аспазіі, ці Аспажы, жонкі Яна Райніса, у гонар якой назвалі бульвар у Рызе. Яе ў дзявоцтве ведалі як Іаану Эмілію Лізету Разенберг. Ну, а сам спадар Хаім працаваў яшчэ і пад псеўданімам, узятым ад прозвішча бабулі па маці, — Бакст. Гэта значыць, ён жа — яшчэ і той самы Леў Самойлавіч Бакст, без якога, напрыклад, дзягілеўскія «рускія сезоны» ў Парыжы былі б, напэўна, не такімі рускімі.

Але не будзем адхіляцца ад падарожжа: мы спыніліся на ўладальніках.

Гаспадар, значыцца, — выдатны прадпрымальнік, дзелавы, самавіты чалавек. Гаспадыня — маладзейшая за яго гадоў на сямнаццаць, не квактуха і не фіфа, а нешта сярэдняе — «вытанчаная куртуазная асоба». Так яе, прынамсі, любяць называць. Калі яны не выйдуць павітацца з вамі асабіста, то абавязкова сустрэнуць у пярэднім пакоі з партрэтаў, уціснутых у авальныя парныя рамы, выраблены ў майстэрні Баравікова ў Санкт-Пецярбургу: гаспадар — у шыкоўным смокінгу і з завітымі па модзе вусамі, гаспадыня — у собалевым паланціне і з кудзеркамі «дробным д'яблікам».

Ёсць меркаванне, што буфецік гэты створаны паводле эскіза Фёдара Шэхтэля і выраблены на фабрыцы Хаіма Разенберга.

Якія ў іх могуць быць прычыны да вас не выйсці? Амаль ніякіх — і самыя розныя. Калі не выйдуць, то ведайце, што гаспадар, магчыма, сядзіць за грувасткім пісьмовым сталом чырвонага дрэва, задуменна пазіраючы на крылы бронзавай птушкі, распасцёртыя над дзвюма шкляны-

Рамантыкам

Мо выдумляюць, а мо і не. Кажуць, што перад акном пакоя пані Ядвігі Любанскай была клумба ў форме сэрца. Амуры, кветкі, мары і фантазіі... Яна, кажуць, была такой. Не ветранай, але рамантычнай. Імідж сядзібы стварала менавіта яна — на грошы мужа і з вялікай любоўю. Падабалася шмат каму. А сама, кажуць, закахалася ў Мусіна-Пушкіна, з-за чаго ўся гэтая гісторыя, што спарадзіла легенду пра здань, і адбылася. У 1905 годзе яго адазвалі ў Санкт-Пецярбург, ён пісаў ёй, а муж пра ўсё здагадваўся. Трагедыя адбылася пасля пышнага святкавання 35-годдзя гаспадыні. Магчыма, яна не вытрывала асуджэння мінскай публікі, надта ж схільнай да дэталёвага абмеркавання розных падрабязнасцяў і нічым асабліва не заклапочанай. Яўстахій Любанскі паехаў тады на Каўказ і недзе там праз восем гадоў памёр.

мі чарніліцамі, якія паабапал той птушкі стаяць. Можа, рыхтуецца пісаць ліст да экс-генерал-губернатара Мінска Мусіна-Пушкіна, адазванага ў Санкт-Пецярбург. Але нічога яму, відаць, так і не напіша. Гаспадыня, хутчэй за ўсё, занятая разгляданнем і перастаноўкай талерак мейсенскай мануфактуры: упрыгожаныя вензелем W, яны памятаюць сцены Віланаўскага палаца ў Варшаве, а іх цёмныя беражкі больш за ўсё пасуюць да хрустальных кубкаў з выявамі анёлаў і замкаў. У чым іншым дык мо не так, але ў стылі art nouveaux былая паненка Кяневіч з-пад Мазыра выдатна арыентуецца. Адукацыю яна атрымала ў Варшаве, а густам валодае ад прыроды. Кажуць, вельмі любіць падабацца — і мужчынам, і паненкам. Каб першыя, маўляў, захапляліся, а другія — каб перамалёўвалі фасоны яе сукенак. Яна лёгка можа падзяліцца строямі з пакаёўкай, якую называе на французскі манер — Бланш. Тая мо ніякая не Бланш, а якая-небудзь Марыся, але для гаспадыні сваёй — толькі Бланш.

Вы яшчэ не разгадалі гэты квэст? Вернемся да пачатку.

Стары гандлёвы тракт — гэта тое самае, што тракт Ігуменскі, з даўніх часоў і да нашых дзён ён менавіта так і называецца. Гаворачы пра княжацкае ложа, трэба мець на ўвазе легенду пра Лошыцу, у якой распавядаецца пра тое, як адзін князь выправіўся ў ваенны паход супраць брата. Спыніўся ён пераначаваць на ўзгорку каля Мінска — аж раптам забіла пад ім крынічка. Князь падумаў, што гэта знак: ваяваць нельга, трэба вяртаць войска назад. Так вайна і не пачалася, а месца княжацкага ложа сталі звацьпроста ложам, пазней — Лошыцай. Лошыц, што праўда, існавала шмат, але ў нашым падарожжы размова ідзе пра ўладанне сям'і Любанскіх — Яўстахія і Ядвігі. Гэта яны віталі вас з партрэтаў. Авальныя рамы апошніх, як і мейсенскія талеркі, і кубкі з анёламі, і буфецік-вітрына, і аздобленае метлахскай кафляй бюро-паставец, і размешчыны на ім куфэрак для дакументаў, і сярэбраны кандэлябр галандскай мануфактуры на шэсць свечак, і чаканныя пано нямецкіх майстроў, і дэкаратыўная венская талерка з амурамі, што лунаюць у нябёсах, і шмат што яшчэ — усяго каля сарака прадметаў 1900 года паходжання, эпохі нараджэння выразу made in, — прадметы з калекцыі мінскага мастацтвазнаўца Віталя Жукава.

Талеркі мейсенскай мануфактуры, упрыгожаныя вензелем W, памятаюць сцены Віланаўскага палаца ў Варшаве і больш за ўсё падыходзяць да хрустальных кубкаў з выявамі анёлаў і замкаў.

Увесь пярэдні пакой у Лошыцкай сядзібе Любанскіх, адкрытай для наведвальнікаў леташняй вясной, афармлены паводле яго ідэй у стылі, скапіраваным з art nouveaux, французскага мадэрну.

Калі гаспадары не выйдуць павітацца асабіста, то абавязкова сустрэнуць у пярэднім пакоі з партрэтаў, уціснутых у авальныя парныя рамы, выраблены ў майстэрні Баравікова ў Санкт-Пецярбургу.

Калі вам надакучыла слухаць пра пані Ядвігу Любанскую як тапельніцу, цела якой знайшлі каля рэчкі і пахавалі ў сямейнай каплічцы, а потым, калі каплічку разбурылі, знайшлі ў свінцовай труне, якую пусцілі на пераплаўку... Калі вам не надта цікава чарговы раз чуць пра тое, як блукае па Лошыцкім парку здань пані Ядвігі ці як праплывае яна ж на фоне месяца ў ноч, калі зацвітае магнолія... Калі вы не вялікі аматар такіх вось аднабокіх гісторый і не вельмі ў іх верыце... Тады пакой з партрэтамі гаспадароў (там яшчэ сцены адметныя — смарагдавыя і з чаротавым дэкорам пад столлю) ствараўся спецыяльна для вас. Там вас — памятаеце? — чакаюць...

Значыць, запіўшы смачна звараным кавай апетытны ранішні бутэрброд, вы накіроўваецеся ў бок старога гандлёвага тракта...

Падарожнічала Святлана ДЗЯНІСАВА.

Паслядоўнікам

Капліцу, дзе хавалі паноў Любанскіх, разбурылі ў 1920-я. Убачыць яе на свае вочы такой, якой яна была ў часы росквіту сядзібы ў Лошыцы... Не «немагчыма», а «было б немагчыма» — калі б не існаваў некалі мастак Юзаф Пешка. На яго акварэлі, што захоўваецца цяпер у Львове, адлюстравана Лошыца — такой, якой яна выглядала дзве сотні гадоў таму. Удалечыні злева — тая самая каплічка.

Капліцу, дзе хавалі паноў Любанскіх, разбурылі ў 1920-я. Убачыць яе на свае вочы такой, якой яна была ў часы росквіту сядзібы ў Лошыцы... Не «немагчыма», а «было б немагчыма» — калі б не існаваў некалі мастак Юзаф Пешка. На яго акварэлі, што захоўваецца цяпер у Львове, адлюстравана Лошыца — такой, якой яна выглядала дзве сотні гадоў таму. Удалечыні злева — тая самая каплічка.

КОТ У САБАЧАЙ ШКУРЫ

Радасці і цяжкасці ўтрымання чатырохлапага спартсмена

«Спачатку вы заводзіце хаскі, а пасля яны — вас», — упэўнена Каця КУРАЧОВА, уладальніца трохгадовага здаравяка Рыкі. Муж Каці, Валяр'ян МІХАЙЛОВІЧ, разам з сабакам удзельнічае ў спаборніцтвах, дзяўчына займаецца піярам каманды. Падобныя да ваўкоў, з вачыма рознага колеру (афарбоўка «арлекін». — Аўт.) сібірскія хаскі сёння ў модзе. Дзеля справядлівасці варта сказаць, што, акрамя радасці, сабака прыносіць і шмат клопату. Гаспадары Рыкі раяць будучым сабакаводам добра падумаць перад тым, як завесці «снежнага сябра».

СВАБОДАЛЮБІВЫ ПРЫГАЖУН

— З пародай мы ўпершыню пазнаёміліся ў 2011 годзе на спаборніцтвах «Снежныя сабакі». У іх, акрамя іншых парод, прымаюць удзел і паўночныя ездавыя: аляскінскі маламут, сібірскі хаскі, самаед, эскімоская лайка, — узгадвае Каця. — Мы з Валяр'янам актыўна наведвалі выставы, гутарылі з заводчыкамі. І праз год канчаткова вызначыліся: бяром хаскі.

Для пары Рыкі стаў першым выхаванцам. Каця прызнаецца, што ўзялі яго, бо вельмі прыгожы. Аднак цяпер яна ўпэўнена: для сабакаводаў-пачаткоўцаў хаскі — не самы ўдалы выбар.

— Не верце таму, што пішуць пра пароду ў інтэрнэце, гэта поўная лухта, — кажа дзяўчына. — На практыцы большасць парад не працуе.

Сабакі гэтай пароды вельмі актыўныя, свабодалюбівыя і самастойныя, любяць быць у цэнтры ўвагі і патрабуюць шмат пяшчоты. Для аховы хаскі не выкарыстоўваюць, бо яны не бачаць у чалавеку ворага і не могуць нанесці яму шкоду нават у выпадках, калі трэба абараніць гаспадара. (Ад хаскі не пачуеш брэху: яны рыкаюць, як мядзведзі. — **Аўт.**) Каця пацвярджае: калі Рыкі падчас гульні робіць чалавеку балюча, то моцна пужаецца сам. Крыху раззлавацца ён можа хіба падчас вычэсвання поўсці.

Хаскі слаба паддаюцца дрэсіроўцы ў поўным сэнсе гэтага слова, у чым нам давялося пераканацца на свае вочы. За морквіну ці іншую смакату Рыкі гатовы сесці, легчы, даць лапу, але... «шоу» трывае пару секундаў. Карацей, атрымаць з хаскі нямецкую аўчарку не атрымаецца, хоць паспрабаваць можна. Паверце, яны разумеюць усё, што ім кажуць, але рашэнне — выконваць каманду ці не — прымаюць самайстойна. Яшчэ адзін важны момант: як добра б ні жылося пушыстаму сабаку з гаспадаром, ён у любы момант можа ўцячы. Нечакана чуць такое пра ласкавага і гуллівага хаскі, якому за шчасце быць у кампаніі дзяцей, дурэць...

— Сапраўдны кот у сабачай шкуры, — падсумоўвае Каця.

Праз паўгода пасля з'яўлення сабакі ў дзяўчыны пачалася алергія на поўсць, але думкі аддаць Рыкі іншым людзям не было: «Выкінуць сабаку са свайго жыцця прасцей за ўсё. Паспрабуйце пазмагацца і перамагчы». Каця і сёння п'е вітаміны, павышае імунітэт.

З БЕГУНОЎ — У ВЕЛАГОНШЧЫКІ

Валяр'ян і Каця ўзялі Рыкі, калі яму не было і двух месяцаў. Пароду выводзілі спецыяльна для язды, таму Рыкі наканавана было стаць спартсменам. Але спачатку хаскі браў узнагароды на выстаўках, нават мог атрымаць званне чэмпіёна краіны, ды гаспадары перадумалі. Тытул адыгрывае ролю толькі для далейшага развядзення сабакі. Хоць Рыкі мае радавод і шчаняты ад яго атрымаліся б выдатнымі. Але пара не думае разводзіць сабак. Каця раіць браць шчаня з дакументамі: гэта дазволіць пазбегнуць такой праблемы як блізкароднаснае скрыжаванне. Нядобрасумленныя заводчыкі могуць прадаць сабак, якія здалёк падобныя да хаскі: зазвычай іх аддаюць без радаводу.

Актыўна займацца спартыўнай падрыхтоўкай выхаванца Валяр'ян і Каця пачалі, калі Рыкі споўніўся год. Трэніравалі самастойна, пакуль не пазнаёміліся з аднадумцамі — удзельнікамі грамадскага аб'яднання «Клуб паўночных ездавых сабак», які існуе з 2011 года. На свае першыя спаборніцтвы Рыкі трапіў у два гады.

«Не верце таму, што пішуць пра хаскі ў інтэрнэце, гэта поўная лухта. На практыцы большасць парад не працуе».

Гонкі на сабачых запрэжках маюць доўгую гісторыю. Першае спаборніцтва паміж вандроўнікамі адбылося ў сярэдзіне XIX стагоддзя ў Канадзе. Сёння гонкі дзеляцца на два тыпы: снежныя і бясснежныя. Да першых адносяцца скіджорынг (калі сабака цягне лыжніка), гонкі на нартах (некалькі сабак цягнуць спецыяльныя сані, на якіх стаіць каюр — спартсмен) і іншыя. Спаборніцтвы па бясснежных відах ездавога спорту, альбо драйлэнды, у нашай краіне звычайна праводзяцца два разы на год — увосень і ўвесну. Гэта канікрос: удзельнічаюць адзін бягун і адзін сабака. У байкджорынгу спартсмен едзе за сабакам на веласіпедзе. Скутар: спартсмен едзе за сабакам на падобным да дзіцячага вялікім самакаце. Найбольш відовішчныя сярод іх — гонкі на картах, дзе выкарыстоўваецца невялікая калясніца, у якую запрэжана некалькі сабак. Валяр'ян і Рыкі пачалі свой спартыўны шлях з канікросу, але пасля перайшлі на байкджорынг.

— «Завіруха» (зімовыя гонкі на паўночных ездавых сабаках, якія праводзяцца ў Беларусі. — **Аўт.**) — справа нашага клуба. Першыя спаборніцтвы прайшлі ў 2011 годзе. У апошнія гады з надвор'ем нам усё часцей не шанцуе — снегу няма, — распавядае Каця. — Самі ўдзельнічаем з 2014 года, прымалі ўдзел у асеннім і вясновым драйлэндзе ў Вязынцы. Ездзілі пад Піцер на чэмпіянат па ездавым спорце і ў Латвію, дзе спаборнічалі ў чацвёртым этапе міжнародных спаборніцтваў Baltic Cup. Дарэчы, упершыню этап міжнародных спаборніцтваў адбудзецца сёлета ў Беларусі.

Штотыдзень удзельнікі клуба праводзяць агульныя трэніроўкі на розных трасах у горадзе. Раз на месяц выязджаюць у Вязынку, там знаходзіцца добрая траса. Для сабак важная нагрузка. Спартсменам таксама трэба быць у добрай форме, таму Валяр'ян бегае і катаецца на роварах.

Сабак трэніруюць пры камфортнай тэмпературы (да 17 градусаў вышэй за нуль). Улетку падрыхтоўкі няма, спёка становіцца сапраўдным выпрабаваннем для пухнацікаў. Рыкі ледзь вытрымлівае ранішнія прагулкі, таму асноўны праменад адбываецца пасля захаду сонца. Гаспадары стараюцца часцей вывозіць яго на вадаёмы.

У Рыкі бываюць праблемы з матывацыяй: часам ён не можа бегчы ў пастаянным спартыўным рэжыме і вяхляе па баках. Але, на думку Каці і Валяр'яна, ён выступае добра, у сваім класе сабака займае месца ўжо ў сярэдзіне спіса. І гэта толькі пачатак яго спартыўнай кар'еры.

Снежныя сабакі бачаць у чалавеку толькі сябра.

Торт з ялавічнай пячонкі — найлепшы падарунак для імянінніка.

ТОРТ З ПЯЧОНКІ ДЛЯ ІМЯНІННІКА

На дзень нараджэння Рыкі атрымлівае сапраўдны торт з ялавічнай пячонкі, пасыпаны сырам і морквай — любімыя далікатэсы, за якія ён гатовы душу прадаць. Бывае, што Каця набывае ялавічны язык — тады ў хаскі свята. Кормяць сабаку кормам прэміум-класа, які дазваляе трымаць яго ў добрай фізічнай форме. У параўнанні з іншымі пародамі падобнай камплекцыі хаскі ядуць адчувальна менш, таму яго харчаванне не б'е па кішэні.

Насуперак стэрэатыпам, у аднапакаёвай гарадской кватэры, Рыкі пачуваецца добра: на думку гаспадыні, трэба гуляць ды трэніравацца з сабакам як мага больш: тады і дом, і мэбля будуць цэлыя. Ён мае ўласны куток — дамок-«лабараторыю», дзе можа адасобіцца з ласункамі ці цацкамі. Кідаюцца ў вочы вельмі кароткія фіранкі: іх давялося абрэзаць, каб Рыкі не пагрыз. Усе каштоўныя рэчы стаяць высока на шафе — ізноў жа, у мэтах бяспекі. На самой шафе відаць сляды зубоў. Паводле слоў гаспадыні, з цягам часу да іх, як да малюнкаў дзіцяці на шпалерах, прывыкаеш, а потым і ўвогуле пачынае здавацца, што яны тут нават дарэчы. Нягледзячы на ўсе цяжкасці, звязаныя з утрыманнем сабакі, свайго жыцця без Рыкі Каця не ўяўляе. І калі б не алергія, з задавальненнем завяла б яшчэ аднаго гадаванца.

Цяпер у Рыкі пачаўся перыяд падрыхтоўкі да спаборніцтваў. Зычым снежнаму сабаку і яго гаспадарам поспеху ў спартыўнай кар'еры.

Кацярына РАДЗЮК.
Фота Надзеі БУЖАН і з асабістага архіва Кацярыны КУРАЧОВАЙ ды грамадскага аб'яднання «Клуб паўночных ездавых сабак».

Хаскі, маламуты, самаеды выводзіліся спецыяльна для язды.

■ Слова кінолагу

Навошта вам сабака?

— Утрыманне сабакі — гэта свайго роду філасофія, — лічыць **кінолаг, інструктар-дрэсіроўшчык службова-спартыўных сабак Андрэй ШКЛЯЕЎ.** — Прычыны, якія падштурхоўваюць нас завесці чатырохногага сябра, самыя розныя. Многія набываюць для душы. Гэта сабакі-кампаньёны. Спецыялісты заводзяць сабак для канкрэтных мэт: для працы, заняткаў спортам. Кінолагі — для племяннога развядзення. Чатырохногі сябра можа стаць выдатнай нянькай для дзетак. Аднак самая распаўсюджаная прычына — мода і папулярнасць пароды.

Парады для тых, хто сумняваецца:

— Вызначыцеся, ці маеце вы дастаткова часу для зносін з сабакам (прагулкі, харчаванне, гігіенічныя мерапрыемствы, выхаванне, адукацыя). Пагаварыце з дасведчаным суседам-сабакаводам, паназірайце за ім і яго гадаванцам, каб зразумець, ці гатовы вы выдаткоўваць свой вольны час. Паназірайце, як ён сябе паводзіць пры выхадзе з чатырохлапым сябрам з кватэры, спускаючыся ў ліфце альбо па лесвіцы. Не забудзьцеся зазірнуць да яго і ўвечары. Калі праз пару дзён вы шчыра запытаецеся ў сябе «А яно мне трэба?», усё вырашыцца само сабой. Калі вытрымаеце хаця б тыднёвы выпрабавальны тэрмін, гуляючы з сабакам уранку і ўвечары, у вас ёсць рэальны шанц стаць добрым «сабачнікам».

Што трэба ўлічваць?

Узрост. Дзесяцігадоваму хлопчыку, напрыклад, цяжка справіцца з сенбернарам.

Змена прывычнага распарадку дня і звычак. Калі вы хочаце вырасціць і выхаваць добрага сабаку, вашай галоўнай звычкай мусяць стаць правільныя паводзіны з жывёлай.

Здароўе і фізічная падрыхтоўка гаспадара. Будзьце гатовы да актыўнага ладу жыцця.

Тэарэтычная падрыхтоўка: вывучыце гісторыю развіцця пароды, яе анатомію і фізіялогію, правілы і метады ўтрымання, методыку выпрацоўкі ўмоўных рэфлексаў, умовы, якія ўплываюць на самаадчуванне і працаздольнасць сабакі, характэрныя памылкі ўласнікаў.

«КУЮ-КУЮ НОЖКУ,


Уладзімір ЛІПСКІ

Генадзь АЎЛАСЕНКА

Іван КРУК

Ірына БУТОРЫНА

Тамара ПАТУК

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Раіса БАРАВІКОВА

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«Дзеці ахвотна вучацца, калі ім цікава»

Р. БАРАВІКОВА: Дзіцячая літаратура ва ўсе часы мела велізарнае значэнне, бо выхоўвае асобу. У маім дзяцінстве чытанне было нормай, як зубы пачысціць. Сёння, на жаль, на змену кнігам прыйшлі камп'ютарныя гульні, шоу. Таму перад намі стаіць няпростая задача — прывучыць (а не прымусіць!) дзяцей чытаць штодзень.

У. ЛІПСКІ: Сапраўды, галоўная задача дзіцячай літаратуры — выхоўваць. І часопіс можа дапамагчы кнізе ў гэтай важнай справе. Толькі за мінулы год у «Бусі» мы надрукавалі творы 35 беларускіх пісьменнікаў, у «Вясёлцы» — удвая больш. Даём магчымасць праявіць сябе на старонках часопісаў і юным творцам. Я ўжо сем гадоў уручаю прэмію Васіля Віткі таленавітым дзецям. І мару аб выданні двухтомніка: «Хрэстаматыя «Бусі» для дашкольнікаў» і «Хрэстаматыя «Вясёлкі» для малодшых школьнікаў».

І. БУТОРЫНА: Калі я працавала настаўніцай, мы разам з вучнямі ўдзельнічалі ў праекце часопіса «Вясёлка» «Міс Вясёлка». Ён закрануў шмат школ, праводзіўся ў два этапы. Канкурсанткі павінны былі знайсці пэўны твор з «Вясёлкі», вывучыць і выразна прачытаць яго на памяць. Члены журы задавалі пытанні: «Хто аўтар гэтага твора? Што ты ведаеш з яго жыцця? Чаму асабіста цябе навучыў гэты твор?» і інш. Падключылася сям'я кожнай дзяўчынкі-ўдзельніцы, настаўнікі, аднакласнікі. Дзеці настолькі глыбока акунуліся ў літаратуру, прачыталі шмат новых твораў, паглыбілі веды пра беларускіх пісьменнікаў. Часопіс «Вясёлка» — ініцыятар шматлікіх цікавых рэспубліканскіх праектаў, якія можна з поспехам выкарыстоўваць, каб рэалізаваць дзіцячую дапытлівасць, актыўнасць. Дзеці ж ахвотна вучацца, калі ім цікава.

У. ЛІПСКІ: Ірына Буторына, дарэчы, па матэрыялах «Вясёлкі» распрацавала 50 ўрокаў і напісала ўнікальную кнігу «Урокі «Вясёлкі». Спадзяёмся, што сёлета яна выйдзе ў друк.

(Заканчэнне. Пачатак на 1 стар. «СГ».)

Т. ПАТУК: Якімі б добрымі ні былі кнігі ды часопісы, калі не рэкламаваць, мала шанцаў, што нехта пра іх даведаецца. Не першы год выходжу з ініцыятывай да цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска: давайце сумесна з Міністэрствам культуры, Міністэрствам інфармацыі, Міністэрствам адукацыі зробім праграму, якая б прывабліла дзяцей у бібліятэкі. Лічу, што кожнага школьніка хаця б адзін раз трэба прывесці да нас на эскурсію, каб ён убачыў кнігі, у тым ліку і беларускіх аўтараў.

Н. ДРЫЛА: Мае знаёмыя маладыя бацькі скардзяцца, што не хапае беларускіх кніг для самых маленькіх, па якіх можна вучыцца чытаць па складах...

У. ЛІПСКІ: Хачу іх парадаваць. У выдавецтве «Мастацкая літаратура» пачалі такую серыю. Не так даўно выйшла кніга «Бусева школка» ў выдавецтве «Харвест», якую мы напісалі ў суаўтарстве з Раісай Баравіковай. Яна дапаможа тым, хто збіраецца ў школу, пазнаёміцца з чароўнымі літарамі беларускага алфавіта ды з загадкавымі лічбамі. Больш за тое, з выдавецтвам «Адукацыя і выхаванне» мы задумалі выдаць бібліятэку «Вясёлкі» — 100 кніг. Усё самае лепшае, што было ў часопісе за 60 гадоў (у наступным годзе будзе юбілей). 10 кніг ужо выйшла.

«Культура перадаецца з малаком маці»

Н. ДРЫЛА: Нядаўна ў «Фэйсбуку» прачытала перапіску сваіх былых аднакурсніц. «Каця: «Хацела падарыць пляменніку кнігу, але вырашыла пакінуць сабе. Яна чароўная. Хутка ўсе грошы спушчу на дзіцячыя кнігі». Аляксандра: «О, гэта мне знаёма! Толькі нядаўна супакоіліся крыху, таму што ставіць няма куды. Столькі файнага выходзіць. Добра, што адгаворка ў мяне ёсць — дзеці вельмі кніжкі любяць і заўсёды рады новай». Каця: «А ў мяне дзяцей пакуль няма, таму «загулы» з кніжкамі няма на каго спіхнуць. Проста стараюся не паказваць свайму маладому чалавеку новую пакупку». Паболей бы такіх матуляў-чытачак (у тым ліку і будучых)...

І. КРУК: 20 гадоў таму ў Верхнядзвінскім раёне я сядзеў і даймаў 84-гадовую бабульку: культура перадаецца з малаком маці, культура перадаецца з малаком маці... Раптам яна мяне перапыніла: «Яначка, даражэнькі, паслухай мяне, калі я замуж выходзіла, то як пра вялізарную бяду казалі пра маці, якая да года не дакарміла дзіця сваім малаком. А цяпер пакажы ты мне такую жанчыну, якая сваім малаком дакарміла дзіця да года». Таму трэба ісці не толькі да дзяцей, але і да іх бацькоў. Расказваць ім пра дзіцячыя кнігі, рэкламаваць іх.

М. ПАЗНЯКОЎ: Добра было б, каб з'явілася адмысловая тэлеперадача для бацькоў і іх дзяцей, дзе ў гульнявой форме распавядалася б пра кніжныя навінкі.

«Варта паказваць, што беларус — самы разумны, самы кемлівы, самы добры і самы мудры. Калі нашы дзеткі будуць бачыць у казках такога беларуса, яны і беларускую мову палюбяць».

Р. БАРАВІКОВА: Прычым абавязкова на першым канале. А назваць можна «Чытанка»...

У. ЛІПСКІ: Ёсць ідэя пры тэатры юнага гледача стварыць клуб дзіцячых пісьменнікаў, дзе праводзіць літаратурныя вечары, у тым ліку з элементамі спектакля. Таксама цудоўна было б правесці рэспубліканскую навукова-практычную канферэнцыю на тэму «Роля літаратуры для дзяцей у выхаванні дашкольнікаў і малодшых школьнікаў». А па яе выніках выдаць зборнік.

Г. АЎЛАСЕНКА: Вельмі балючае пытанне для бацькоў — кошт кніг. У маім дзяцінстве былі тоненькія дзіцячыя кніжачкі. Яны каштавалі па 5 капеек. Мы іх не бераглі (можа, гэта дрэнна), але ж мы іх чыталі. У прамым сэнсе зачытвалі да дзірак. Сёння бацька наўрад ці набудзе за сто з нечым тысяч беларускую кніжку. Тым больш калі побач ляжыць расійская за 40-50 тысяч.

І. КРУК: Цудоўна было б, каб на дзіцячую літаратуру НДС знялі. Ва ўсім свеце для нацыянальнай дзіцячай кніжкі ёсць ільготы.

Р. БАРАВІКОВА: Паглядзіце, як настойліва шведы нясуць сваю культуру ў іншыя краіны. Я часта бываю ў мінскай бібліятэцы імя Астроўскага, там цэлы паверх адвялі для дзетак. Усталявалі домікі, Карлсана, які жыве на даху, ды іншых герояў шведскіх казак. Беларускія нашы дзеткі прыходзяць туды, гуляюць. У нас жа такое багацце ў літаратуры, такія насычаныя гісторыя, фальклор, народныя традыцыі. Чаму мы саромеемся, хаваем усё гэта?

М. ПАЗНЯКОЎ: Сапраўды, трэба падымаць прэстыж беларускай дзіцячай літаратуры. Гэтаму магло б паслужыць і з'яўленне дзяржаўнай прэміі за найлепшую кнігу для дзяцей.

І. КРУК: Варта заахвочваць не толькі дзіцячых пісьменнікаў, але і выдавецтвы, якія актыўна выдаюць дзіцячую літаратуру, узорныя сям'і, найлепшых настаўнікаў, загадчыкаў бібліятэк — усіх тых, хто аддае свой талент і вопыт выхаванню дзетак.

«Сям'я павінна быць клетачкай, падмуркам, з чаго ўсё пачынаецца»

М. ПАЗНЯКОЎ: У 70-80 гады беларускамоўныя выданні для дзяцей выходзілі вялікімі тыражамі. Сёння такія ж кніжкі, яшчэ і больш таленавітыя, цікавейшыя, лепш аформленыя, выходзяць максімум па 2-3 тысячы... Проста намнога звузілася чытацкае кола.

Н. ДРЫЛА: Нядаўна я была на прэзентацыі новай кнігі, выдадзенай у перакладзе на беларускую мову, шведскай пісьменніцы Юі Вісландэр. Там было вельмі шмат маці

■ Таленты

ВЯСЁЛКАВАЯ «КАЛЯДНАЯ ЗОРКА»

Заззяла ў Нацыянальнай бібліятэцы

Каля 500 дзяцей з усёй Беларусі з'ехаліся днямі ў сталіцу, каб паказаць свае таленты на Першым адкрытым міжнародным фестывалі-конкурсе творчых калектываў «Калядная зорка-2016», арганізаваным рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Сябры Вясёлкі» і часопісамі «Вясёлка» і «Буся».

Неўзабаве «Вясёлцы» споўніцца 60, і юбілейную дату вырашылі адзначыць святам дзяцей, распачаўшы такі конкурс, расказаў **Уладзімір ЛІПСКІ, галоўны рэдактар часопіса і старшыня журы.**

— Мы хочам, каб дзеці нам, дарослым, паказалі, як яны растуць, якія яны добрыя і таленавітыя і як здорава тое, што дарослыя ў іх укладваюць. Давайце зробім усё, каб гэтыя божыя пасланнікі адчувалі сябе людзьмі на Зямлі, ведалі пра свае здольнасці і верылі ў сябе і ў тое, што іх Радзіма з кожным годам будзе ўсё больш квітнець. Вышэйшай задачы ў нас, дарослых, няма, — прамовіў ён.

Тэматыка конкурсу, які складаецца з дзевяці намінацый, — «Чароўны свет Каляд і Новага года». Праграма выступленняў творчых калектываў была вельмі разнастайнай: дэфіле, акцёрскае майстэрства, мода, танцы, спевы і іншае. Ураэіла таксама прафесійнае, дарослае журы, у склад якога ўвайшлі народны артыст Беларусі Эдуард Зарыцкі, намеснік старшыні беларускага фонду культуры Тадэвуш Стружэцкі, галоўны рэжысёр тэатра сатыры і гумару «Хрыстафор» Яўген Крыжаноўскі, галоўны стыліст Нацыянальнай школы прыгажосці Андрэй Варашкевіч, дырэктар салона «Фрыда» Аксана Злыгасцева, вядомыя пісьменнікі і іншыя майстры культуры.

Фота Надзеі БУЖАН.

Усе выступоўцы атрымалі дыпломы ўдзельнікаў і падарункі. Асаблівым момантам фестывалю стала ўручэнне дзеячам культуры, якія друкаваліся на старонках «Вясёлкі», прэміі імя Васіля Віткі — заснавальніка часопіса. Гэты медаль атрымалі празаік Андрэй Федарэнка, паэт і перакладчык Ганат Чарказян і мастачка Аксана Аракчэева. За найлепшы твор года ўзнагародзілі асаблівай імянной прэміяй і юных талентаў: Настассю Снытко за апавяданне «Гісторыя чырвонага «запарожца» і Серафіма Раула за верш «Павучкі» і загадкі. Дзеці атрымалі таксама мяккую цацку — Грошыка — галоўнага героя казкі «Грошык і таямнічы кошык» Уладзіміра Ліпскага.

Сімвалічна, што ўзнагароды за літаратурныя поспехі ўручаліся ў галоўнай кніжнай скарбніцы Беларусі — Нацыянальнай бібліятэцы, дзе праходзіў першы дзень фестывалю, што сведчыць пра цесную повязь таленавітасці і адукаванасці.

Ірына СІДАРОК

■

ПАЕДУ Ў ДАРОЖКУ...»

з дзеткамі. Для іх паводле сюжэту кнігі паказалі лялечны спектакль. Кнігу прадавалі амаль па 200 тысяч, тым не менш яе купілі. Мне здаецца, мы павінны не толькі больш актыўна прыцягваць увагу да сваёй беларускамоўнай дзіцячай літаратуры і перыёдыкі, але і рабіць гэта больш крэатыўна.

Р. БАРАВІКОВА: Апошнія гады тры назіраю, як на кніжных выставах, што на Янкі Купалы, раптам пачалі бегаць маладыя таты і мамы ў пошуках беларускамоўнай чытанкі для сваіх маленькіх дзетак. І гэта мяне радуе. Менавіта ад гэтых дзетак у многім залежыць будучыня нашай роднай мовы. Памятаю, мы з маёй Ленай (ёй тады гады тры было), глядзелі спектакль. Адным з галоўных герояў быў дзед-беларус, як у нас любяць паказваць, у лапцях, паласатых штанах — латка на латцы. Жонка на яго з віламі кідаецца, пан яго б'е, крыўдзіць, і нават чорт штурхае ды падманвае. Па дарозе дадому пытаюся ў дачкі: «Ну як, Леначка, спадабаўся табе спектакль?» — «Мама, а баба Ніна дзеда Андрэя таксама б'е вілами?» — пачула я ў адказ. Варта паказваць, што беларус — самы разумны, самы кемлівы, самы добры і самы мудры. Калі нашы дзеткі будуць бачыць у казках такога беларуса, яны і беларускую мову палюбяць.

Т. ПАТУК: У нашай бібліятэцы беларускамоўная літаратура займае 10%. І мы актыўна займаемся яе папулярызацыяй. Праводзім на беларускай мове дні сямейнага адпачынку, ладзім прэзентацыю кожнага нумара «Вясёлкі» і «Бусі» для ўсіх школ і садкоў рэгіёна абслугоўвання. Мы можам купіць любую беларускамоўную кнігу, але праблема ў тым, што дзеці не разумеюць мовы. Таму на самым вышэйшым узроўні павінна быць прынята рашэнне, каб ва ўсіх дзіцячых садках і школах на роўных гучалі дзве дзяржаўныя мовы.

І. БУТОРЫНА: Настаўнік павінен не толькі любіць мову, але і зрабіць так, каб яна стала трапяткой, блізкай для дзіцяці. Пачынаць гэтую працу трэба ў педуніверсітэце. Калі я чытаю методыку выкладання беларускай мовы і літаратуры, стараюся на практычных занятках прывесці студэнтаў у бібліятэку, каб яны ўбачылі рэальныя кнігі, з якімі могуць працаваць на ўроках пазакласнага чытання. Заўсёды былі настаўнікі, апантаныя сваёй працай. Хацелася б, каб іх лепшы вопыт папулярызаваўся, перадаваўся студэнтам.

І. КРУК: Неяк адна з мінскіх школ запрасіла мяне правесці сустрэчу з вучнямі 7 класа. «Давайце сёння пагаворым пра традыцыі беларускага вяселля», — прапанаваў ім. Бачу — у вачах пытанне. Хлопчык устае: «А што такое вяселле?» ...Так, пад ляжачы камень вада не цячэ, таму дзякуй за тое, што вы (звяртаецца да Тамары Патук. — **Аўт.**) робіце — ставіце помнік беларускаму слову. Але гэтага мала. І не з дзіцячых садкоў і школ трэба пачынаць. Сям'я павінна быць першаснай клетачкай, падмуркам, з чаго ўсё пачынаецца.

Т. ПАТУК: Я з вамі згодна. Але добра, калі 50% бацькоў, якія наведваюць нашу бібліятэку, наогул чытаюць са сваімі дзеткамі (я ўжо не кажу па-беларуску)...

«Малое, якое чытае, больш паспяховае ў жыцці»

Н. ДРЫЛА: На бацькоўскім форуме адна маладая маці піша: «Як вы лічыце, ці варта чытаць дзіцяці пра Карлсана? Ён няправільна сябе паводзіць, я баюся, што ён навучыць дрэннаму маё дзіця». Як вы лічыце, ці апраўданы бацькоўскі страх? І якімі, на ваш погляд, павінны быць героі дзіцячых казак?

Фота Надзеі БУЖАН.

Г. АЎЛАСЕНКА: Самае цікавае, што бацькоў не турбуе, што дзіця ў камп'ютарныя гульні гуляе, серыялы глядзіць! Ужо Карлсан вінаваты...

У. ЛІПСКІ: Дарэмныя гэтыя хваляванні. Дзеці больш кемлівыя, чым нам, дарослым, здаецца, яны разбяруцца, што да чаго.

І. БУТОРЫНА: Маленькім трэба чытаць уголас. Безумоўна, само дзіцятка здолее толькі выхапіць імёны герояў, з чаго пачалося дзеянне, чым скончылася. А што падштурхнула таго ж самага Карлсана зрабіць той ці іншы ўчынак? Чаму менавіта так разгортваліся падзеі? Вось гэтыя прычынна-выніковыя сувязі павінны тлумачыць бацькі і настаўнікі. Калі мы гаворым, які ўплыў кожная кніга можа пакінуць у свядомасці дзіцяці, шмат што залежыць ад таго, як дарослыя правялі гэтае абмеркаванне.

Р. БАРАВІКОВА: У нашым жыцці з'яўляецца вельмі многа жорсткасці. Я плакала, калі даведалася, што маладая маці выкінула дзіця з акна, а параўнальна маладыя бацькі пакінулі памяраць немаўлятка ў кватэры... Казкі павінны сеяць добрае і вечнае, быць прывіўкай супраць такіх жахаў.

Г. АЎЛАСЕНКА: Існуе думка: калі дзеці будуць чытаць толькі добрыя светлыя казкі, дзе вельмі правільныя «прычасаныя», ідэальныя героі, ім будзе яшчэ цяжэй сутыкацца з рэальным, часам даволі жорсткім жыццём. Маўляў, малых з дзяцінства трэба прывучаць, што свет можа быць жорсткім, не варта давяраць усім.

І. КРУК: Давайце будзем закладваць светлае, мёд, а дзёгаць яны самі знойдуць.

Н. ДРЫЛА: А што вы ў свой час чыталі сваім дзецям, а цяпер — унукам? Узгадайце кнігу, якая стала вызначальнай у вашым жыцці? Магчыма, ваш досвед стане штуршком для маладых бацькоў, якія будуць чытаць гэты артыкул.

У. ЛІПСКІ: У маёй першай вясковай настаўніцы была багатая бібліятэка. Яна давала нам кнігі дадому чытаць. Мне чамусьці запомніліся «Васількі» Эдзі Агняцвет. Прайшлі гады, мы пазнаёміліся з ёй, яна мяне рэкамендавала ў Саюз пісьменнікаў. Як бачыце, у жыцці нічога выпадковага не бывае. Я перакананы, што дзіця, якое чытае, больш паспяховае ў жыцці. Таму запрашаю бацькоў далучацца да акцыі «Сямейнае чытанне», якую ладзіць Міністэрства інфармацыі сумесна з Выдавецкім домам «Звязда». І ў прыватнасці да сямейнага чытання разам з «Вясёлкай»: мы плануем за гэты год надрукаваць творы 12 беларускіх аўтараў, якія будуць суправаджацца ілюстрацыямі ды заданнямі з прызамі.

І. КРУК: Майму старэйшаму ўнуку 4 гады. Да трох гадоў я яго выхоўваў выключна на дзіцячым фальклоры. Рабіў масаж і прагаворваў уголас лічылкі, загадкі, скарагаворкі.

М. ПАЗНЯКОЎ: Згодны, трэба пачынаць прывіваць цікавасць да чытання з фальклору, з народных казак, легендаў, паданняў. Гэта аснова як усёй літаратуры, так і выхавання душы чалавека. Тата мой вельмі многа казак ведаў: «Бацькаў дар», «Сіўка-Бурка»...

У. ЛІПСКІ: Як я табе, Міхась, зайздрошчу, што твой бацька быў адукаваны, ведаў казкі. Мае бацькі непісьменныя, умелі толькі распісацца. Але якія мудрыя педагогі, святыя людзі! Ніколі не забудуся, як мама разбудзіла мяне ранкам са словамі: «Сынок, пайшлі, я табе штосьці пакажу». Яна павяла мяне па расе на сенажаць, каб паказаць, як узыходзіць сонца. Вось педагогіка нашых бацькоў была. Маладым бы павучыцца! А то яны цяпер толькі ў цырк водзяць. І гэта, вядома, важна, але куды важней паказаць прыроду: як кветачка цвіце, як пчолы мёд збіраюць. «Мускулы» душы трэба загартоўваць.

Р. БАРАВІКОВА: Бацькоў можна ўпікнуць, што яны адварочваюць дзіця ад кніжкі, часопіса і накіроўваюць на нейкае дзіцячае шоу. Колькі перадач, дзе дзяўчаткі маленькія, ім па 5-6 гадоў, а яны ўсе пры касметыцы...

Т. ПАТУК: Мая першая і любімая кніжка на беларускай мове — «Піліпка-сынок». А яшчэ, Уладзімір Сцяпанавіч, вам маці паказала, як узыходзіць сонца, а мяне вадзіла любавацца на жытнёвае поле. «Паглядзі, казала, дачушка — мора». Вось яна, любоў да роднага.

І. БУТОРЫНА: Калі я была маленькай, мая бабуля са мной шмат гуляла, выкарыстоўвала фальклорныя забаўлянкі: і «Кую-кую ножку», і «Сарока-варона», і «Казачка-ласачка». Спачатку гэта для дзіцяці проста цёплы кантакт са сваёй матуляй, бабуляй, татам, дзедам. Пасля гэта на доўгі час як быццам схавалася дзесьці глыбока ў маёй душы. Калі ж сама нарадзіла сына, мне таксама захацелася дакрануцца, «пагуляць» з маленькімі пальчыкамі, перадаць цеплыню свайго сэрца. І ўсе слоўцы ўспомніліся самі сабой. Калі бацькі лічаць, што гэта ўжо састарэла, што не на плыні часу, то яны вельмі памыляюцца і пазбаўляюць сваё дзіця самага каштоўнага.

У. ЛІПСКІ: Усе слушныя прапановы, якія гучалі падчас дыскусіі, я занатаваў. Назбіралася больш як 20. Давайце давядзём іх да зацікаўленых міністэрстваў і ведамстваў, тых, хто вырашае гэтыя пытанні, каб наша размова не засталася проста размовай.

Надзея ДРЫЛА.

■ Маміны дзённікі

НЕ ПАСПРАЧАЕШСЯ

— Хоць бы раз за сабой цацкі ты прыбраў, Ян!

— Ты цудоўна ведаеш, мама, што АДЗІН раз я прыбраў свае цацкі ў заплечнік. Хіба не памятаеш?

☺ ☺ ☺

АНТОШЫНЫ ВЕСЯЛІНКІ:

— Тры дні — гэта колькі?

— Шпакоўня для папугаяў.

— У мамы вушы свецяцца ад радасці.

— Яму засталося надзець толькі гузікі.

— У мяне стомленасць скончылася і пачалася бадзёрасць.

— А чым мне гуляцца (разгублена азіраецца): паўсюль адзін толькі парадак!

☺ ☺ ☺

СЛУШНАЯ ПАРАДА

— Як пагляджу на выпаленую Антонам грыву львяняці, увесь настрой псуецца, — засмучаюся я.

— Лепш табе тады не глядзець! — раіць мне Ян.

☺ ☺ ☺

ГАВАРКІ АЎТОБУС

Едзем у аўтобусе на спектакль «Вясёлы чамадан». Ян з Антонам сядзяць на першых сядзеннях ля кабінкі. Праз яе шкло відаць, як кіроўца аб'яўляе ў мікрафон прыпынак. Ян узрадавана страпянуўся:

— Ой, аказваецца, гэта дзядзя кіроўца гаворыць! А я раней думаў, што сам аўтобус аб'яўляе прыпынкі.

☺ ☺ ☺

ДОБРЫ ВОЎК

Ян расказвае сваю версію казкі пра Чырвоны Каптурок:

— А потым Чырвоны Каптурок пытаецца ў бабкі-ваўка: «Бабуся-бабуся, а чаму ў цябе такія вялікія рукі?» — «Каб цябе мацней абдымаць!» — адказвае добры воўк.

☺ ☺ ☺

У АЎТОБУСЕ

Яначка садзіцца на зэдлік, Антоша кладзе галаву яму на калені і тлумачыць:

— Ян — пасажыр, а я — цяжкая сумка. Мы адпраўляемся ў паездку.

☺ ☺ ☺

ЖЫХАРЫ НЕБА

— Дзе жывуць дажджавыя чарвякі? — цікавіцца Ян і асцярожна ступае праз «матузочкі», якія поўзаюць па мокрым асфальце.

— У зямлі! — адказваю.

А ён хітра ўсміхаецца: мяне не падманеш, задзірае галаву ўгору і паказвае пальцам на неба:

— Яны падаюць з неба разам з дажджом!

☺ ☺ ☺

БУДЗЕМ ЗНАЁМЫЯ!

— Антон экзаменуе Яна:

— Як тваё прозвішча?

Ян маўчыць.

— Як цябе завуць? — ніяк не адчэпіцца Антоша.

Тут Ян не вытрымлівае:

— Мы што, з табой не знаёмыя?!

☺ ☺ ☺

МАСТАК

Ян забрудзіў акно пальцамі і любуецца:

— Гэта хто так прыгожа запэцкаў?

☺ ☺ ☺

ТАТАЎ ВЫРАТАВАЛЬНІК

Дакараю нашага тату:

— На тваім жалі далёка не заедзеш!

— А на чым заедзеш?

— На аўтобусе! — падказвае тату Ян.

Занатавала Ала ЖУР.

А пра што гавораць вашы дзеці? Дасылайце свае гісторыі.

■ Бабуля, пачытай!

Загадала мама Наце:
Пасядзі, дачушка, у хаце,
Пагуляй тут з коткай Мусяй,
А я ў крамку — і вярнуся:
Ты пакажаш мне малюнкі,
Я табе аддам ласункі...
— Толькі мне? А Мусьцы, мама?
Ёй ласункаў дай таксама!

Галіна НІЧЫПАРОВІЧ,
в. Магільна, Уздзенскі раён.

■ Фотаздымак з гісторыяй

МАЦІ І...164 НАШЧАДКІ!

Што трэба для сямейнага шчасця? Дом, машына, шмат грошай, безумоўна, добры падмурак, але, пагадзіцеся, без дзіцячага смеху ўсё гэта з часам страціць сэнс. Сёння шмат для каго трое дзяцей ужо мяжа, а раней такія сем'і наогул не лічылі шматдзетнымі. На фота, якім падзяліўся Уладзімір Капуза, галоўны рэдактар Магілёўскай абласной аграрнай газеты «Зямля і людзі», толькі частка яго братоў і сясцёр.

Злева направа, ніжні рад — Косця, бацька Максім Іванавіч з Вовам, маці Васіліна Іванаўна з Васільком; верхні рад — Пётр, Раман і Тэкля, 1954 год.

Сям'я амаль праз 40 гадоў. Злева направа, ніжні рад — Сцёпа, бацька Максім Іванавіч, маці Васіліна Іванаўна; верхні рад — Уладзімір, Васіль, Канстанцін, Надзя, Мікалай, Тэкля, Пётр, Андрэй, пачатак 1980-х.

Не трапілі ў кадр яшчэ пяцёра — Сцяпан, Люба, Надзя, Мікалай і Андрэй. Дакладней, Андрэй ёсць, але за кадрам. У якасці фатографа. У 50-я гады мінулага стагоддзя ён адзіны ў вёсцы меў у асабістым карыстанні славутую «лейку» — фотаапарат, апеты ў так званым гімне ваенных карэспандэнтаў. Карэспандэнтам ён не быў, але лічыўся першым на вёсцы фотамайстрам. І быў старэйшым з дзяцей у вялікай сям'і Максіма і Васіліны Капузаў, якія выхавалі дзесяцярых сыноў і дачок. Вунь той сімпатычны малы ў квяцістай сукенцы (ці, як тут называлі на польскі манер, капоце) — ніхто іншы, як будучы рэдактар Уладзімір Капуза. У 1954 годзе, калі быў зроблены гэты здымак, яму споўніўся ўсяго годзік. На той момант ён быў восьмы, самы малодшы з дзяцей. Праз 2 гады нарадзіўся яшчэ адзін хлопчык, потым — дзяўчынка.

У іх роднай вёсцы Сварынь Драгічынскага раёна мірна ўжываліся беларусы, украінцы, палякі. Да 1939 года гэта была тэрыторыя Польшчы. А да сваякоў з Валынскай вобласці, што ва Украіне, сям'я хадзіла нават пешшу. У тыя часы яшчэ не было нават думкі пра нейкую там мяжу і пашпартны рэжым. Адно было кепска: з усіх бакоў Сварынь абступалі балоты і грамадскі транспарт курсіраваў туды толькі адзін месяц на год. На ўвесь астатні перыяд дарога станавілася непраходнай для тэхнікі. Людзі перасоўваліся выключна пешшу. Затое падчас вайны немцы нават не рызыкавалі сюды сунуцца. Мясцовыя больш баяліся ашалелых бандэраўцаў, якія маглі нечакана наляцець і ўчыніць расправу.

Адгрымела вайна, вярнуўся з фронту бацька, вядомы на ўсё навакольле каваль. Ён мог і каня падкаваць, і калёсы адрамантаваць. Сям'я хоць і не шыкавала, але хлеб у доме быў заўсёды. Бацькоўская хата, на фоне якой пазіруе сям'я, не была вялікай. Але маці Васіліна Іванаўна (на здымку яна трымае рукой няўрымслівага Васільку) клапацілася, каб кожнаму ў ёй было ўтульна. «Маці — гэта сонейка маё, святы чалавек, яе нам вельмі не хапае, — з пяшчотай у голасе ўзгадвае Васіліну Іванаўну сын. — Калі яна памерла, святар казаў, што не было лепшай прыхаджанкі, чым яна. За ўсё жыццё ніколі не павысіла голас, ад яе павявала спакоем. Памятаю, як цяжка было мне, падлетку, раніцай уставаць пасвіць кароў. Яна, каб крышачку ўсцешыць, цішком совала ў кішэню першы агурок або нешта іншае, больш смачнае. У яе любімчыкаў не было, яна ўсіх аднолькава шанавала, нікога не вылучала. Але кожнаму, як магла, спачувала. Худзенькая, маленькая: яе саму трэба было абараняць. Я паспеў запісаць на плёнку яе голас, дзе яна расказвае пра сваё жыццё. Колькі ж маёй матулечцы прыйшлося гора сербануць! Вайна, цяжкая сялянская праца, выхаванне дзяцей. Як маці-гераіня яна была ўзнагароджана ордэнам з залатой зоркай».

Па сутнасці, Васіліна Іванаўна 13 разоў нараджала (двойчы няўдала, а яшчэ адна яе дачушка Насця зусім маленькай памерла падчас вайны).

«Гляджу на гэтае фота і быццам вяртаюся ў дзяцінства, — прызнаецца Уладзімір Капуза (здымак вісіць у яго кабінеце на пачэсным месцы). — Мы жылі, лічы, у самай глушы Палесся, але не сумавалі. А як было цікава вучыцца ў нашай пачатковай школе! Пад яе адвялі самую вялікую хату ў вёсцы. На ўсе малодшыя класы была адна настаўніца. Зімой, бывала, замерзнем па дарозе ў школу, і яна, каб мы хутчэй адагрэліся, дазваляла слухаць урокі на печцы.

Памятаю, як бацька ездзіў на заробкі. А бліжэй да восені вяртаўся з вялікім запасам збожжа. Мы ніколі не куплялі хлеб, маці яго пякла з перамолатага зерня. А я быў галоўны млынар *(усміхаецца)*. Тады дзяцей да працы прывучалі з маленства. Дарослыя пойдуць, а я, чатырохгадовы, гляджу маленькую сястрычку. Быў нянькай, потым да 7 класа пастушком. Спачатку ў вёсцы кожны сваіх кароў пасвіў, а потым пачалі збіраць у статак і ганяць на пашу па чарзе. Да 10 гадоў я ўжо умеў і касіць, і араць, і каня запрэгчы. Вясковыя дзеці гэтую навуку праходзілі па поўнай праграме... У жыцці яна вельмі спатрэбілася. І вучыўся без троек (па пяцібальнай сістэме). Пасля школы адразу ж на журфак паступіў, ва ўніверсітэт. Першы ў вёсцы! Гэта было вельмі ганарова. Маці радавалася, але ў Мінск не адпускала, пакуль усю бульбу не выкапалі. Як той казаў, вучоба вучобай, але спачатку справа. Цяпер гэтыя гады ўзгадваюцца, як найлепшыя ў жыцці. І перш за ўсё я ўдзячны за іх маці. Гэта такое шчасце — жыць у вялікай сям'і! Маю матулю можна лічыць багатай жанчынай. Яе ўжо няма, але засталіся 38 унукаў, 90 праўнукаў і 28 прапраўнукаў».

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.
Фота з сямейнага архіва Уладзіміра КАПУЗЫ.

Шаноўныя чытачы! Конкурс «Фотаздымак з гісторыяй» працягваецца. Мы па-ранейшаму чакаем ад вас цікавых фота з сямейнага альбома (за выключэннем леташніх здымкаў з курорта, вясельных фотасесій і сучасных фота дзяцей). Вам ёсць што паказаць і расказаць? Давайце пагартаем сямейныя альбомы разам! Фотаздымкі (не больш за тры) з гісторыяй дасылайце з адпаведнай пазнакай на адрас: 220013, г. Мінск, вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а або info@zvyazda.minsk.by. Найлепшага аўтара чакае прыз. Арыгіналы дасланых фотаздымкаў абавязкова вяртаюцца

■ ЭкаШКОЛКА

КАЗАЧКА ПРА МОНСТРА

А давайце, я сёння проста раскажу вам казку? Мы распавядалі яе аднойчы на занятку ў дзіцячай экастудыі ў Гродне.

На адной невялічкай планеце жыў монстр. Так ўсе называлі яго праз тое, што быў ён маўклівым, не любіў хадзіць у госці, узімку падоўгу спаў, а ў цёплую пару займаўся любімай справай — вырошчваў іншапланетныя моркву з буракамі, кавуны (як вядома, белыя), фіялетавыя ў жоўтыя крапінкі гарбузы, серабрыстыя трускалкі, чырвоны агрэст і сінія парэчкі — агароднічаў, адным словам. Глеба на той планеце давала такі ўраджай, што садовыя дрэвы, бывала, пладаносілі і паласатымі шкарпэткамі, і рознакаляровымі талеркамі, і кніжкамі з вялікімі малюнкамі, і нават цёплымі зімовымі шалікамі з аленямі... У цяпліцы разам з памідорамі саспявалі пернікі і гарбата з бергамотам.

Так цягнулася доўгі час, і монстр быў шчаслівы.

Але аднойчы знайшоў ён на сваім агародзе дзіўныя рэчы: некалькі пустых бутэлек і пакетаў з незнаёмага матэрыялу. «Адкуль гэта?» — падумаў монстр і на ўсялякі выпадак вырашыў іх пасадзіць. Якім жа было яго здзіўленне, калі ні пакет, ні пустая бутэлька не далі ўраджаю — затое расліны і кветкі побач пачалі імкліва сохнуць. З тых часоў дзіўныя прадметы падалі на яго агарод штодня, прыносячы шмат клопату.

Монстр збіраў усё ў асобны мех. Аднойчы ён заўважыў: на некаторых з рэчаў, што падаюць, стаяць адмысловыя знакі, якія, як ён здагадаўся, былі ШЫФРАМ!

Ён старанна вывучаў тыя знакі: яны павінны наблізіць яго да разгадкі таямніцы!

І вось адным цудоўным днём монстр сеў у невялічкі міжпланетны экспрэс і пакінуў сваю планету і свой агарод — не забыўшыся, праўда, прапалоць моркву.

На другой планеце — называлася яна Зямля — было шумнавата (а монстр шуму не любіў, таму стараўся як мага радзей сюды наведвацца). Пакінуўшы свой карабель на паркоўцы — той не патрабаваў шмат месца — монстр пакрочыў на дзіцячую пляцоўку, бо адзіныя, хто яго не пужаўся, былі дзеці. Да таго ж ён ведаў, што яны адразу пераходзяць да сутнасці пытання.

Ён падышоў да кампаніі, што сядзела ў пясочніцы, павітаўся — бо быў ветлівым — і высыпаў перад імі свой мех.

— Вой, што гэта?

— А гэта што?

Дзеці ўсхапіліся і пачалі гуляцца з рэчамі.

— Эй, гэтая цацка зламаная!

— А бутэлька пустая!

— Гэта проста смецце, — канстатаваў старэйшы хлопчык. — Яго трэба выкінуць.

Ён падхапіў некалькі прадметаў і пацягнуў іх да сметніцы, што стаяла каля лаўкі.

— Не-не, пастой, — прарыкаў монстр (монстры, як вядома, рыкаюць). І тут ён дастаў дзіўную рэч, якую зрабіў сам. — Як вы думаеце, што гэта? Правільна! Гэта — кантэйнер. Правільны кантэйнер для смецця.

І монстр расказаў усё, аб чым даведаўся падчас вывучэння зямнога смецця. А таму, што больш за ўсё на агарод прыляцела пластмасавых рэчаў, ён распавядаў пра пластык.

Аказваецца, знакі на бутэльках і скрынях — гэта нумары. Яны паказваюць тып пластыку. Дзеці ў захапленні пачалі сартаваць смецце адпаведна нумару.

Вы ведалі, што пластык можа быць небяспечным? Пазбягайце нумароў 3, 6, у якія запакавана ежа! Нумарамі 1 і 2 можна карыстацца толькі аднойчы. А вось 4 (ім абазначаецца поліэтылен нізкай шчыльнасці) і 5 (поліпрапілен) — параўнальна надзейныя.

Нарэшце смецце было адсартавана! Монстр стаміўся і ўжо збіраўся ляцець дадому, але ўзгадаў самае галоўнае. Ён пакінуў дзецям тое, чым звычайна карыстаюцца на ягонай планеце, каб захоўваць ежу і хадзіць па крамах. Аказваецца, і на нашай планеце ёсць такія рэчы: шкляныя слоікі і бутэлькі, тэрмакубкі, прыгожыя палатняныя торбачкі... Калі мы іх выкарыстоўваем, то купляем менш пластыку, а значыць, падтрымліваем сваю планету ў чысціні!

— Ну, бывайце, — развітаўся монстр. — Час паліваць пернікі.

І паляцеў.

Яго ўжо даўно не чуваць, гэтага монстра. Як думаеце — ці падае дагэтуль на яго агарод смецце?

Рыма УШКЕВІЧ, кіраўніца дзіцячай экастудыі ў Гродне.

Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.

■ Ведай нашых!

«АНГЛІЙСКІ СНЯДАНАК» АД ЮРЫЯ ЯКАВЕНКІ

Свой 50-гадовы юбілей знакаміты мастак-графік, ганаровы грамадзянін Гродна Юрый Якавенка адзначыў, вядома ж, выставай. Канешне, у родным горадзе — у Гродзенскай выставачнай зале. Прычым назва выставы даволі інтрыгуючая — «Англійскі сняданак».



Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

У 2008 годзе Юрый Якавенка праілюстраваў твор беларускага паэта і асветніка эпохі Адраджэння Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Як і ў даўніну, кнігі рабіліся ўручную, на спецыяльнай паперы і ў дарагім скураным пераплёце. Пры гэтым беларускім мастаком і яго італьянскім партнёрам, друкаром Джуліяна Якамучы, рухала жаданне аднавіць гістарычную справядлівасць, бо Гусоўскі пісаў «Песню пра зубра» па замове Папы Рымскага Льва X, але той памёр, і паэму ў Італіі не выдалі. І вельмі сімвалічна, што гэтая кніга ўсё ж трапіла ў Ватыкан: міністр замежных спраў нашай краіны Сяргей Мартынаў уручыў яе Папе Рымскаму Бенедыкту XVI як падарунак ад Беларусі — Радзімы Міколы Гусоўскага. Кнігу падарылі таксама каралеве Вялікабрытаніі Лізавеце II, прэзідэнту Партугаліі.

Два гады таму Юрый Якавенка ажыццявіў другі падобны праект з серыі «art book»: зноў жа ў партнёрстве з італьянцамі ён праілюстраваў кнігі «Песня песень цара Саламона» — на італьянскай і англійскай мовах (тыражом 130 экзэмпляраў кожная). Прычым і тут ёсць сувязь з Беларуссю, бо, як вядома, гэты твор выдаваў невялікай кніжкай Францыск Скарына.

Сярод знаўцаў і аматараў творчасці Юрыя Якавенкі ён вядомы найперш як майстар графічных афортаў. І раптам... На юбілейнай выставе ў Гродне мы бачым, здавалася б, нетрадыцыйныя для мастака акварэлі на разнастайныя матывы. А сапраўдным сюрпрызам стала тое, што 16 работ Юрый Якавенка выканаў на... талерках з англійскага фарфору. Адсюль і назва экспазіцыі. Вось так мастак-графік, бадай, упершыню паказаў сябе і як майстар акварэльнага жывапісу.

На прэзентацыі выставы ў адрас яе аўтара прагучала шмат цалкам заслужаных ацэнак як мастака еўрапейскага ўзроўню, якім Беларусь павінна ганарыцца. Нехта ад хвалебных слоў мог бы і зазнацца. Аднак, ведаючы Юрыя Якавенку, не сумняваюся, што нейкая «зорная хвароба» яму не пагражае. Хаця і ў яго ёсць сваё «зорнае неба»:

— Гэта маё жыццё. І нешта прыбавіць, нешта адняць не атрымліваецца. Я сапраўды шчаслівы чалавек, бо мне пашанцавала, што ў мяне такія бацькі, што вучыўся ў такім школьным класе, што былі выдатныя выкладчыкі ў Акадэміі мастацтваў, што ў мяне такая сям'я, такія цудоўныя сябры і калегі ў Гродне. Без усіх іх было б нешта не так, можа, пайшоў бы іншай дарогай. Усе яны — маё «зорнае неба».

Барыс ПРАКОПЧЫК.
prakopchik@zviazda.by

Даведка «Звязды»

Юрый Якавенка нарадзіўся ў пасёлку Смалянінава Прыморскага краю Расійскай Федэрацыі. Вучыўся ў Рэспубліканскай школе-інтэрнаце па музыцы і выяўленчым мастацтве імя Ахрэмчыка ў Мінску. Скончыў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў. Правёў 64 персанальныя выставы ў розных краінах — Беларусі, Іспаніі, Кітаі, Літве, Галандыі, Бельгіі, Польшчы, Швецыі, Кіпры, Расіі, Даніі, Францыі і іншых. Мае 35 узнагарод на міжнародных і нацыянальных конкурсах. Працы мастака знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі, Музеі сучаснага мастацтва (г. Мінск), Гродзенскім гісторыка-археалагічным музеі, Полацкай карціннай галерэі, Бібліятэцы Ватыкана, Графічным кабінеце каралеўскага сходу (Швецыя), музеі «D. Almondi» (г. Хаціва, Іспанія), кабінеце гравюры і малюнка «Museo Civico» (г. Крэмона, Італія), у бібліятэках прэзідэнта Партугаліі (г. Лісабон), каралевы Вялікабрытаніі Лізаветы II і Чартарыжскіх (г. Кракаў, Польшча), у іншых дзяржаўных і прыватных калекцыях. Абраны Ганаровым акадэмікам Расійскай акадэміі мастацтваў.

Калісьці пачалося ўсё з нуля —
З нічога ў цемры зоркі узнікалі,
І Млечны Шлях, як Божая ралля,
Вёў за сабою у нямыя далі.

І сёння пачалося ўсё з нуля —
Тэрмометр застыў на лічбе гэтай,
А потым — непрыкметна, спакваля
Край ахінулі снежныя саеты.

Жывуць у згодзе неба і зямля,
Яднае вечнасць крохкія імгненні...
Два цуды пачынаюцца з нуля:
Стварэнне Свету і Зімы стварэнне.

■ Фестывалім

ФЛЕЙТА АМЕНДУНІ, ТРУБА ГУТМАНА І КАЛЯДНЫ БАЛЬ

У Брэсце прайшлі «Студзеньскія музычныя вечары»

Фэстываль класічнай музыкі ў горадзе над Бугам традыцыйна праходзіць у калядныя дні. І гэта прыдае яму яшчэ большую святочнасць. Таму цалкам лагічна, што ў другі дзень фестывалю пасля канцэрта адбыўся сапраўдны Калядны баль. Кружыліся пары ў вячэрніх уборах, гучалі вальсы. А на пачатку была ўверцюра да оперы Расіні «Сарока-зладзейка», якую бліскуча выканаў сімфанічны аркестр Брэсцкага драматычнага тэатра пад кіраўніцтвам Аляксандра Сасноўскага. Гэты калектыў радаваў высокай музыкай і ў астатнія дні фестывалю.

Нельга не сказаць і пра другі сімфанічны аркестр, які выступаў на «Вечарах». Калектыў створаны ў Брэсцкім дзяржаўным музычным каледжы імя Р. Шырмы і працуе пры нязменным кіраўніцтве Людмілы Жабінскай. Маладыя музыканты аказаліся на вышыні выканаўчага майстэрства. А студэнтка 4-га курса Таццяна Глушаніна сыграла сольную партыю фартэпіяна з першай часткі Першага канцэрта для фартэпіяна з аркестрам Сяргея Рахманінава і сарвала шквал апладысментаў.

Сярод юных талентаў гэтым разам былі і зусім маленькія. Так, вучаніца чацвёртага класа Яўгенія Мацук выканала прыгожы паланез Шапэна. Яшчэ меншы па ўзросце піяніст з Польшчы Пшэмыслаў Рэліга таксама атрымаў дыплом удзельніка фестывалю. Хлопчык, дарэчы, выступіў са сваёй асобнай праграмай на канцэрце ў музкаледжы.

Калядная атмасферы, вядома, уласцівыя розныя цуды. Так, у праграме свята самым першым стаяла выступленне хору «Кантатрыкс» з Нідэрландаў. Але за хвіліну да пачатку па зале прайшла пагалоска, што галандскі калектыў не прыехаў, бо яго па нейкіх прычынах завярнулі на мяжы. І вось калі аб'явілі пра завяршэнне праграмы першага дня, калі кветкі і дыпломы ўдзельнікаў былі ўручаны, на сцэну літаральна ўзляцеў кіраўнік калектыву Ханс Лендэрс і праз перакладчыка паведаміў, што яны вельмі шчаслівыя, бо паспелі, хоць і затрымаліся на мяжы. Хор выканаў «Аве Марыя», «Самая цёмная ноч у снежні». Калядныя мелодыі, здавалася, уліваліся ў душу.

Як і праз флейту італьянца Антоніа Амендуні. Маэстра ўшаноўвае брэсцкі фестываль сёмы раз. І кожны раз прымушае любіць яго чароўную флейту зноў і зноў. У другі дзень канцэрта італьянскі прафесар іграў дуэтам са сваёй вучаніцай Беатрычэ Мапа. Разам з флейтыстамі партыю фартэпіяна выконвала беларускі канцэртмайстар Кацярына Матох.

Салістка Марыінскага тэатра Марыя Максакава.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Гэтая віртуозная піяністка стала знаходкай фестывалю. Як сказала дырэктар «Вечароў« Лілія Батырава, ёй давялося тэрмінова шукаць у краіне музыканта, які б за суткі мог авалодаць партытурай і сыграць для італьянскіх флейтыстаў. Такога музыканта знайшлі ў асобе мінчанкі Кацярыны Матох.

Яна атрымала ноты, а ў наступны вечар паспяхова замяніла музыканта, які не прыехаў па прычыне хваробы.

У трэці дзень фестывалю заслужаныя авацыі атрымала маладая беларуская піяністка Юлія Ермалаева. Ніхто не іграў так, як Юлія. Дзяўчына выступала без партытуры, здавалася, яна іграе душой...

Інтрыгай трэцяга дня, несумненна, стала выступленне джаз-квартэта амерыканца Гары Гутмана. У афішы было пазначана: «Гары Гутман — Ганна Герман. Два музычныя светы». Яшчэ задоўга да пачатку фестывалю яго дырэктар Лілія Батырава назвала гэтую праграму эксперыментам. І трэба адзначыць, эксперымент аказаўся вельмі смелым. Бо злучыць разам два зусім розныя светы альбо кірункі — вялікая рызыка. Само па сабе выступленне квартэта было цікавым, асабліва для аматараў джазавай музыкі. Ігралі ўсе музыкі бездакорна.

Ды і ўкраінская спявачка Улада Удоўчанка знешне нечым нагадвае Ганну Герман, і голас у яе падобны, і песні Ганны ў яе выкананні гучалі даволі кранальна. Хоць і ўзнікалі сумненні, ці варта імкнуцца пераймаць голас і манеру вялікай спявачкі. І ўсё гэта разам у адной праграме выглядала крыху дзіўна, тым больш на міжнародным фестывалі класічнай музыкі. Але ж на самым пачатку было сказана, што праграма ўяўляе сабой эксперымент...

Заключным акордам «Вечароў», іх несумненнай іскрынкай стала выступленне салісткі Марыінскага опернага тэатра, вядучай тэлепраграмы «Рамантыка раманса» на тэлеканале «Культура» Марыі Максакавай. Оперная дзіва парадавала слухачоў арыямі з вядомых опер, папуры на тэму рускіх песень і рамансаў.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

■ Узровень!

УЗНАГАРОДУ З ПРАГІ

прывезла юная магіляўчанка

Вольга Канавалава прымала ўдзел у міжнародным дзіцяча-юнацкім музычным фестывалі «Мелодыі зімовай Чэхіі».

Добры старт зрабіла яна ў Год культуры. З фестывалю, у якім прымалі ўдзел каля 500 юных талентаў з Беларусі, Расіі, Чэхіі, Германіі, Літвы, Ізраіля, яна прывезла дыплом пераможцы і статуэтку з багемскага шкла ручной работы. Ёй не было роўных у яе ўзроставай катэгорыі, яна бездакорна выканала дзве песні, адну — на беларускай мове. Дарэчы, на рахунку Вольгі гэта не першая перамога. Яна ўладальнік Гран-пры II адкрытага конкурсу для маладых выканаўцаў «Феерыя мастацтваў», першы лаўрэат рэспубліканскага конкурсу юных выканаўцаў эстраднай песні «Халі-Хало — 2015». Раскрыць музычны патэнцыял Вользе дапамагаюць педагогі магілёўскай узорнай студыі эстраднага вакалу NON STOP пры вучэбна-педагагічным комплексе Дзіцячы сад-сярэдняя школа №42 Таццяна Мінава і Наталля Харкевіч.

Фестываль «Мелодыі зімовай Чэхіі», які стаў зорным для Вольгі, праводзіцца Міністэрствам культуры Чэхіі з мэтай стварэння адкрытай прасторы для развіцця міжнародных стасункаў у галіне музычнай творчасці і развіцця ў моладзі розных краін павагі да сусветных дасягненняў культуры. У ім прымаюць удзел акадэмічныя і народныя хоры, вакальныя і харэаграфічныя ансамблі і салісты, аркестры, фальклорныя калектывы, тэатры мод, музычныя тэатры. Іх майстэрства ацэньваюць заслужаныя дзеячы культуры Чэхіі, Расіі, Італіі, Кубы, выкладчыкі вядучых музычных і харэаграфічных устаноў Еўропы.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

Наименование (описание) имущества и его стоимость

№ п/п лот	Наименование имущества	Кол-во, мера, вес	Отличительные признаки, степень износа	Оценка, общая стоимость
1	Рекламная вывеска	1 шт.	Бывшая в употреблении	9.030.000 рублей
2	Кресло «Престиж»	3 шт.	По стоимости 143.000 рублей за 1 шт.	429.000 рублей
3	Защитный роллет (1370х2250)	1 шт.	Бывший в употреблении	823.000 рублей
4	Защитный роллет (2350х2700)	1 шт.	Бывший в употреблении	1.697.000 рублей
5	Стол письменный с подвесной тумбой	3 шт.	По стоимости 883.000 рублей за 1 шт.	2.649.000 рублей
6	Шкаф двухдверный	2 шт.	По стоимости 518.000 рублей за 1 шт.	1.036.000 рублей
7	Аппарат высокого давления PB10.25-4ЫI186-200	1 шт.	Бывший в употреблении	14.866.000 рублей
8	МФУ PANASONIC KX-MB 1500RU	1 шт.	Бывший в употреблении	789.000 рублей
9	Автомобиль ЗИЛ 131 ВС 222-01	1 шт.	Бывший в употреблении	174.717.000 рублей
10	ПЭВМ ICS	1 шт.	Бывший в употреблении	5.320.000 рублей
11	ПЭВМ HAFF OPTIMA	1 шт.	Бывший в употреблении	1.623.000 рублей
12	ПЭВМ HAFF OPTIMA	1 шт.	Бывший в употреблении	1.267.000 рублей
13	ПЭВМ HAFF OPTIMA	1 шт.	Бывший в употреблении	1.306.000 рублей
14	ПЭВМ HAFF OPTIMA	1 шт.	Бывший в употреблении	1.314.000 рублей

Собственник (владелец) имущества	Витебская область. Право собственности: ОДО «Юверс 2007»
Местонахождение имущества	г. Витебск. По всем вопросам, касающимся осмотра имущества, обращаться к заместителю директора ОДО «Юверс 2007» – Салин Сергей Анатольевич (тел. моб. 8029-895-00-24).
Наличие обременений	Нет
Место (адрес), дата и время проведения торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5, 26 января 2016 года в 10.00
Справочная информация об организаторе торгов	Отдел принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, 210015, г. Витебск, ул. Б. Хмельницкого, 10/1, каб. 2.5 Судебный исполнитель Колядко Александр Михайлович, тел. (0212) 61 40 09, т.м. 37533-687-91-20. Начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (0212) 61 40 15
Условия и порядок проведения торгов	1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (с указанием № лота) на депозитный счет отдела принудительного исполнения управления принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, №3642903001037 филиала № 200 – Витебского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300002505 **не позднее 14.00 25 января 2016 года**. Минимальная величина первого шага торгов – 5% стоимости лота. В соответствии с пунктом 1 Указа Президента Республики Беларусь от 05.05.2009 № 232 «О некоторых вопросах проведения аукционов (конкурсов)» возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги

Результаты рекламной игры «Счастливая покупка-3»

Сведения об организаторе: Совместное общество с ограниченной ответственностью «КонтеТрейд», УНП 590701005, г. Гродно, ул. Победы, 30.

Наименование рекламной игры: «Счастливая покупка-3».

Территория проведения игры: Республика Беларусь.

Срок начала и окончания рекламной игры: 1 сентября 2015 – 20 января 2016.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры №2600 выдано Министерством торговли Республики Беларусь 28 июля 2015 г.

Правила рекламной игры «Счастливая покупка-3» были опубликованы в газете «Звязда» №154(28012) от 14.08.2015.

Сведения о количестве участников рекламной игры: в рекламной игре участвовало 28372 человека.

Сведения о розыгрыше призового фонда: Призовой фонд, общий размер которого составляет 944 829 000 (девятьсот сорок четыре миллиона восемьсот двадцать девять тысяч) белорусских рублей, разыгран полностью.

Ф.И.О. победителей рекламной игры, их выигрыш: Список победителей рекламной игры(с указанием выигранного приза) размещен на сайте **www.HappyBy.com**

Телефоны для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375333777897, +375445040777.

Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки квитанций и страховых полисов:

- квитанции о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС №№ 8678954, 8678955, 8671034;
- полисы по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серии БИ №№1423869, 1423870, 1487847, 1297731, 1407937, 1407938;
- полис по добровольному страхованию имущества физических лиц; добровольному страхованию гражданской ответственности владельцев квартир ф. 2РН, 2РП серии БИ № 0007714.

УНП 100782388

Ликвидатор Частного торгово-производственного унитарного предприятия «Грузовые шины «Дальнобой»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ПРЕДПРИЯТИЯ,

находящегося по адресу: Минский район, д. Сенница, ул. Мирутко, 18:

№ лота	Наименование имущества	Кол-во, шт.	Начальная цена без НДС, бел. руб.	НДС по ставке 20%, бел. руб.	Цена предмета торгов с НДС, бел. руб.
1	Автомобильная шина 1000 R20 FH 116	4	10 000 000	2 000 000	12 000 000
2	Автомобильная шина 11 00 R20 G611	16	90 000 000	18 000 000	108 000 000
3	Автомобильная шина 12 R22.5 M729	4	20 000 000	4 000 000	24 000 000
4	Автомобильная шина 12 R22.5 R297	4	23 500 000	4 700 000	28 200 000
5	Автомобильная шина 1200 R20 18PR TT HF702	4	15 000 000	3 000 000	18 000 000
6	Автомобильная шина 215/75 R17,5 GAR 820	3	6 000 000	1 200 000	7 200 000
7	Автомобильная шина 215/75 R17,5 GDR 619	10	18 000 000	3 600 000	21 600 000
8	Автомобильная шина 215/75 R17,5 GT988+	8	15 000 000	3 000 000	18 000 000
9	Автомобильная шина 215/75 R17.5 M729	8	28 000 000	5 600 000	33 600 000
10	Автомобильная шина 215/75 R17.5 R168	6	16 000 000	3 200 000	19 200 000
11	Автомобильная шина 215/75 R17.5 R184	4	12 000 000	2 400 000	14 400 000
12	Автомобильная шина 215/75 R17.5 R227	4	12 000 000	2 400 000	14 400 000
13	Автомобильная шина 225/75 R17.5 M729	4	12 000 000	2 400 000	14 400 000
14	Автомобильная шина 235/75 R17,5 GAR 820	4	8 000 000	1 600 000	9 600 000
15	Автомобильная шина 235/75 R17,5 GT679	8	16 000 000	3 200 000	19 200 000
16	Автомобильная шина 235/75 R17,5 GT988+	16	32 000 000	6 400 000	38 400 000
17	Автомобильная шина 235/75 R17.5 M729	21	75 000 000	15 000 000	90 000 000
18	Автомобильная шина 235/75 R17.5 R168	9	32 400 000	6 480 000	38 880 000
19	Автомобильная шина 235/75 R17.5 R227	6	18 000 000	3 600 000	21 600 000
20	Автомобильная шина 245/70 R17,5 GT988+	1	3 000 000	600 000	3 600 000
21	Автомобильная шина 245/70 R17.5 R168	4	16 000 000	3 200 000	19 200 000
22	Автомобильная шина 245/70 R17.5 R227	2	8 000 000	1 600 000	9 600 000
23	Автомобильная шина 245/70 R19,5 GT279	11	27 500 000	5 500 000	33 000 000
24	Автомобильная шина 245/70 R19,5 GT279 141/140J	4	10 000 000	2 000 000	12 000 000
25	Автомобильная шина 245/70 R19,5 GT678	11	29 700 000	5 940 000	35 640 000
26	Автомобильная шина 245/70 R19.5 R168	2	8 000 000	1 600 000	9 600 000
27	Автомобильная шина 245/70 R19.5 R227	4	16 000 000	3 200 000	19 200 000
28	Автомобильная шина 265/70 R17.5 M729	4	18 000 000	3 600 000	21 600 000
